Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

10 КРАСАВІКА 2007 г. АЎТОРАК

№ 67 (25932)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

У ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ ТЫДНЯ ЗАХАВАЕЦЦА ХАЛОДНАЕ НАДВОР'Е

Фота БЕЛТА.

У першай палове гэтага тыдня ў Беларусі захаваецца ўмерана халоднае надвор'е, паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава.

Паводле слоў спецыяліста, гэта звязана з паступленнем халодных паветраных мас са Скандынаўскага паўвострава. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны будзе ад мінус 6 градусаў на поўначы да плюс 6 градусаў на поўдні краіны. Удзень — 2—8 градусаў цяпла. У сераду, 11 красавіка, месцамі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Ноччу тэмпература паветра будзе блізкая да нуля. Удзень яна павысіцца да 4—10 градусаў цяпла, у Брэсцкай вобласці — да 13 градусаў вышэй нуля.

У чацвер, 12 красавіка, істотных змяненняў у надвор'і не адбудзецца. У канцы тыдня чакаюцца кароткачасовыя ападкі, пераважна ва ўсходніх раёнах, падкрэсліла спецыяліст. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны будзе каля нуля. Удзень яна складзе ад 5 да 11 градусаў вышэй нуля. У Брэсцкай і Гродзенскай абласцях — да 13—15 градусаў цяпла.

Таццяна ЛОБАС, БЕЛТА.

ЗА ТРАВЯНЫЯ ВЫПАЛЬВАННІ — ДА АДКАЗНАСЦІ

У Гомельскай вобласці да адміністрацыйнай адказнасці за травяныя выпальванні прыцягнуты 48 службовых асобаў і 76 грамадзян. Такія вынікі работы рэгіянальнай службы інспекцыі Дзяржаўнага пажарнага нагляду за сакавік і першы тыдзень красавіка.

Як паведаміў начальнік абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Юрый Парфяненкаў, за гэты перыяд у вобласці зарэгістравана каля 50 ачагоў лясных і тарфяных пажараў. Іх асноўная прычына — парушэнне правілаў пажарнай бяспекі і безадказныя адносіны насельніцтва да навакольнага асяроддзя.

Алена САФРОНАВА, БЕЛТА.

НОВЫ МОСТ

Фота БЕЛТА.

У Верхнядзвінску адкрыты аўтамабільны наплаўны мост цераз Заходнюю Дзвіну.

Збудаванне даўжынёю 254 м звязала два берагі ракі. Гэта пазбавіла вадзіцеляў Міёрскага і іншых заходніх раёнаў Віцебшчыны ад неабходнасці рабіць аб'езд у 130 кіламетраў. Пераправу ўзвялі вайскоўцы 77-га асобнага маставога чыгуначнага батальёна, раскватыраванага ў Віцебску. Пантонная пераправа будзе злучаць два берагі да надыходу зімовых халадоў.

У СМАРГОНІ ВЫРАШЧАНА 6 КГ КАВЫ

У батанічным садзе Смаргонскай дзяржаўнай школы-інтэрната для дзяцей-сірот вырашчана 6 кг кавы. Аб гэтым паведаміла БЕЛТА дырэктар установы Таццяна Уласенка.

Паводле яе слоў, выспеў не характэрны для Беларусі ўраджай за 7 месяцаў. З кафейных дрэў былі сарваны зялёныя зярняты і абсмажаны да цёмна-бурага колеру. У выніку атрымалася вельмі добрая кава, якая на смак і водар нагадвае бразільскую. Наступны ўраджай кавы чакаецца ў верасні—кастрычніку сёлета.

На гэты раз тут маюць намер атрымаць не менш за 10 кг. Батанічны сад у школе-інтэрнаце створаны каля 8 гадоў таму. Цяпер пад яго шкляным дахам растуць больш за 700 дрэў, кустоў і раслін 200 відаў. У тым ліку — і такія экзатычныя, як ананасы, бананы, лімоны. Упершыню завязаліся і плады грэйпфрута.

ВЯСКОВЫ ФЛОТ

Ужо ў маі па прытоку Заходняй Дзвіны — рацэ Обаль, што ў Шумілінскім раёне — будуць ажыццяўляцца экскурсіі на катамаранах. Гэта стане магчымым дзякуючы намаганням мясцовага энтузіяста Анатоля Бычкова — гаспадара сельскай прыватнай сядзібы, дзе прымаюць турыстаў.

Ён зразумеў, што, каб прыцягнуць турыстаў для адпачынку ў вёсцы, трэба прапанаваць ім незвычайную экскурсійную праграму, знайсці тое ў турыстычным сэрвісе, чаго няма ў іншых месцах. Па ўсяму шляху турыстам-«воднікам» падрыхтаваны сюрпрызы: яны змогуць наведаць і старажытныя курганы, дакрануцца да гіганцкіх дубоў, палавіць рыбу, пасядзець ля вогнішча...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«ШЧОДРЫ» ДЫРЭКТАР

Кіраўнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі аднаго з раёнаў Мінскай вобласці «пераблытаў» дзяржаўную кішэню са сваёй.

Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе ўпраўлення КДБ па Мінску і сталічнай вобласці, «шчодры» дырэктар за кошт ЖКГ адрамантаваў грузавік свайго сябра. Не забыўся камунальнік і пра ўласнага «жалезнага каня». Зноў жа за грошы прадпрыемства набыў для свайго легкавіка літыя дыскі. Такім чынам ЖКГ быў нанесены ўрон на агульную суму амаль 10 мільёнаў рублёў.

Адметна, што крымінальная справа за крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі ўзбуджана не толькі супраць дырэктара гаспадаркі, але і ягонага хаўрусніка.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ЗАЛОЖНІКІ ШКОДНАЙ ЗВЫЧКІ...

На мінулыя выхадныя ў краіне было зафіксавана шэраг трагічных здарэнняў, якія справакавала неасцярожнасць людзей падчас курэння.

Так, у вёсцы Клыпенка Барысаўскага раёна ахвярамі адной цыгарэты стала цэлая сям'я. Тут глыбокай ноччу загарэўся дом мясцовага 40-гадовага жыхара. У выніку пажару ў агні загінуў як сам гаспадар, так і яго 37-гадовая жонка і 9-гадовая дачка. У вёсцы Моталь Іванаўскага раёна ад агню не ўратаваліся 72-гадовая пенсіянерка і яе 39-гадовы сын: шкодная звычка аднаго, на жаль, згубіла абодвух.

Падобная ж трагедыя днём адбылася ў вёсцы Заўцце Міёрскага раёна, дзе два мужчыны, адзін з якіх быў сацыяльным работнікам, сталі ахвярамі пажару з-за незатушанай цыгарэты. Поўнасцю агонь знішчыў жылы дом і ў вёсцы Валчкі Шаркаўшчынскага раёна. Загінулыя 70-гадовы гаспадар дома і яго 42-гадовы сын паплаціліся жыццём таксама за сваю неасцярожнасць падчас курэння.

Ігар ГРЫШЫН, Сяргей СТАРЫНАЎ.

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

НАШЫ ДЗЕЦІ ПАЕХАЛІ Ў СЕМ'І

Акцыя «Дзіця — самы дарагі госць у доме» дае плён. У дзіцячым доме № 6 горада Мінска пасля публікацыі ў «Звяздзе» тэлефон разрываецца ад званкоў, некалькі дзяцей ужо з'ездзілі на адпачынак у беларускія сем'і, наконт многіх іншых вядуцца перамовы. Тут складаецца толькі ў тым, што людзям ехаць далёка — з Баранавіч, Мядзела, Будслава... Цяжка людзям і вяртаць малых назад (хоць некаторыя задумваюцца і пра іншыя формы — усынаўленне, прыёмная сям'я), але ўзаемная радасць дае сілы, а слёзы дарослых ачышчаюць іх сэрцы. Падрабязнасці чытайце на 4-ай старонцы.

НА ФОТА: дырэктар дзіцячага дома № 6 Тамара САЎЧАНКА са сваімі любімцамі Таняй ЛЯХАВАЙ, Алінай БЕЛАЙ, Алінай ГУРЭНКА і Таняй ПІРАГОВАЙ (злева направа).

Адпачынак-2007

ДЗЯРЖЗАКАЗ З АДБОРАМ

Сярэдзіна вясны традыцыйна лічыцца часам пачатку перыяду масавых адпачынкаў. Дарэчы, чакаецца, што сёлета толькі праз Рэспубліканскі цэнтр па аздараўленню і санаторна-курортнаму лячэнню насельніцтва змогуць атрымаць пуцёўкі каля 25 тыс. працуючых грамадзян, 445 тыс. школьнікаў, 2,5 тыс. дзяцей-інвалідаў, а таксама 233 тыс. чалавек па «чарнобыльскай» праграме і ў тым ліку 222 тыс. дзяцей з забруджаных тэрыторый. Пры гэтым даводзіцца канстатаваць, што новы сезон мае некалькі асаблівасцяў. І ці не галоўная з іх — аднаўленне фінансавання «дарослага» аздараўлення са сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання.

ГРОШЫ...
ЗА АДСУТНАСЦЬ СКАРГАЎ

Сёлета Рэспубліканскі цэнтр мае дамовы на правядзенне «дарослага» аздараўлення з 71 санаторыем. У параўнанні з мінулымі гадамі колькасць гэтых устаноў зменшылася.

— Апошнім часам нашы санаторыі здолелі значна палепшыць узровень абслугоўвання, дастаткова сказаць, што летась у параўнанні з папярэднімі гадамі колькасць грамадзян з краін блізкага і далёкага замежжа, якія аддалі перавагу аздараўленню ў Беларусі, павялічылася ў 2,6 раза — да 28 тыс. чалавек, — адзначае **намеснік дырэктара Рэспубліканскага цэнтра Генадзь БАЛБАТОЎСКІ.** — Тым не менш пры заключэнні дамоў на 2007 год сярод санаторыяў быў праведзены жорсткі адбор, у выніку якога дзяржзаказ атрымалі толькі самыя вартыя. Прычым для іх вызначэння браліся пад увагу адразу некалькі акалічнасцяў, і ў тым ліку — умовы пражывання і харчавання, наяўнасць медыцынскай базы, а таксама адсутнасць абгрунтаваных скаргаў.

Цікава, што 80 працэнтаў санаторыяў, з якімі сёлета працуе Рэспубліканскі цэнтр, валодаюць 1-й катэгорыяй, а ўсе астатнія — другой. Адначасова не менш важкай падставай для заключэння дамовы сталіся... цэны. У прыватнасці, кажа Генадзь Балбатоўскі, было вырашана — дзяржзаказ павінен прыносіць здраўніцам толькі мінімальную рэнтабельнасць. Такім чынам, у параўнанні са «свабодным», кошт пуцёвак, якія прадастаўляюцца праз Рэспубліканскі цэнтр, атрымаўся на 15—20 працэнтаў ніжэй. Да таго ж з'явілася правіла — сёлета кошт пуцёўкі павінен павышацца не больш чым на 1,5 працэнта ў квартал. І выключэнне з гэтага правіла магчыма толькі ў выпадку значнага пагаршэння фінансавага стану той ці іншай здраўніцы.

ПОЎНЫ КОШТ — «ПРЫВІЛЕЯ» ЗАМОЖНЫХ?

Паводле слоў Генадзя Балбатоўскага, цана пуцёўкі з улікам «стандартнага» набору медыцынскіх працэдур у здраўніцы на тэрыторыі Беларусі вагаецца ў межах 600—650 тыс., а ў беларускія санаторыі за мяжой складае каля 1 млн рублёў. Зрэшты, у дадзеным выпадку трэба адразу зрабіць агаворку — зараз, у адрозненне ад мінулага года, плаціць па поўнаму кошту давядзецца не ўсім, а толькі грамадзянам з пасапраўднаму высокімі даходамі.

— З 1 студзеня ў краіне зноў вярнулася шкала частковай аплаты за пуцёўкі, — нагадвае Генадзь Балбатоўскі. — Скажам, грамадзянам з даходамі да 0,5 сярэднямесячнай зарплаты па краіне трэба аплачваць 15 працэнтаў сабекошту пуцёўкі ў перыяд з 1 лістапада па 30 красавіка і 20 працэнтаў — у перыяд з 1 мая па 31 кастрычніка, грамадзянам з даходам ад 0,5 да 1 сярэдняй зарплаты — адпаведна 20 і 30 працэнтаў, з даходам ад 1 да 1,5 сярэдняй зарплаты — 30 і 40 працэнтаў, ад 1,5 да 2 сярэдніх зарплат — 40 і 55 працэнтаў, ад 2 да 3 сярэдніх зарплат — 50 і 70 працэнтаў, ад 3 да 4 сярэдніх зарплат — 60 і 80 працэнтаў, ад 4 да 5 сярэдніх зарплат — 85 і 90 працэнтаў. І толькі для асобаў з даходам больш за 5 сярэдніх па краіне зарплат прадугледжана 100-працэнтная аплата.

Разам з тым трэба падкрэсліць: сёлета такі парадак частковай аплаты за пуцёўкі датычыцца не толькі працуючых грамадзян. Шкала па сутнасці стала адзінай для ўсіх, і ў тым ліку — для ваеннаслужачых, супрацоўнікаў МУС, прадстаўнікоў іншых сілавых структур, а таксама для пенсіянераў. Прычым тыя ж ветэраны працы будуць накіроўвацца на аздараўленне не толькі ў спецыялізаваныя санаторыі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, але і ў «звычайныя» здраўніцы — для гэтага па лініі міністэрства выдаткоўваецца 5 млрд рублёў.

Яшчэ адно значнае новаўвядзенне датычыцца скасавання традыцыйнай кампенсацыі для «льготных» катэгорый грамадзян за нявыкарыстаную пуцёўку. Замест яе сёлета ўведзена грашовая дапамога на аздараўленне ў памеры 10 базавых велічынь. У прыватнасці, права на такую дапамогу (зноў-такі ў выпадку неатрымання пуцёўкі) зараз маюць Героі Беларусі і Савецкага Саюза, Героі Сацыялістычнай Працы, поўныя кавалеры ордэнаў Айчыны, Славы, Працоўнай Славы, непрацуючыя інваліды Вялікай Айчыннай і інваліды баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, непрацуючыя ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны і непрацуючыя асобы, што бралі ўдзел у размініраванні тэрыторый і аб'ектаў пасля вызвалення ад акупацыі ў 1943—1945 гадах, нарэшце, непрацуючыя ваеннаслужачыя і іншыя «сілавікі», якія сталі інвалідамі пры выкананні службовых абавязкаў.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЗАКЛІКАЕ НЕ ДАПУСЦІЦЬ РАСКОЛУ ПАМІЖ БЕЛАРУССЮ І РАСІЯЙ

Стабільнасць і мір у Беларусі — галоўныя фактары, якія забяспечваюць парадак і дынамічнае развіццё дзяржавы. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 8 красавіка на велікодным богаслужэнні ў Свята-Духавым кафедральным саборы ў Мінску.

Наведванне беларускім лідарам храма ў галоўныя царкоўныя святы стала ўжо добрай традыцыяй. Віншуючы ўсіх суайчыннікаў з Вялікаднем, Аляксандр Лукашэнка пажадаў дабра, шчасця, плённай працы на карысць сям'і і краіны.

«На Ражджаство і Уваскрэсенне Хрыстова, год таму, я абяцаў вам у гэтым храме: як бы ні складвалася сітуацыя, мы будзем жыць у мірнай і стабільнай краіне. І мы з вамі зрабілі для гэтага ўсё. Ужо ніякія сілы не змогуць разбурыць той мір, які склаўся ў нашай дзяржаве. Таму што ён — у вашай свядомасці і вашых сэрцах. Таму што гэта вам, вашым дзецям, сем'ям патрэбныя мір, стабільнасць і парадак», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Яшчэ раз хачу падкрэсліць: я далёкі ад таго, каб сцвярджаць, што мы вырашылі ўсе праблемы ў нашай дзяржаве. Напэўна, не будзе таго часу, каб мы маглі заявіць: усё вырашана. Мы з вамі жывём самастойна ўсяго толькі каля дзесятка гадоў. І вы ведаеце, які шлях мы прайшлі», — сказаў Прэзідэнт.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Падрабязнасці

Выплата пенсій за надыходзячыя выхадныя і святочныя дні пачнецца на 1—3 дні раней за графік

У сувязі з пераносам рабочых дзён з 16 красавіка на 14 красавіка і з 30 красавіка на 5 мая гэтага года, а таксама са святкаваннем Радаўніцы і 1 Мая графік выплаты пенсій падкарэктаваны.

Як паведаміла начальнік упраўлення паштовых тэхналогій і лагістыкі РУП «Белпошта» Валянціна Маліноўская, у сельскай мясцовасці выплата пенсій за 15, 16 і 17 красавіка будзе праведзена напярэдадні — у суботу 14 красавіка. Паколькі гарадскія аддзяленні сувязі будуць працаваць у панядзелак 16 красавіка, то менавіта ў гэты дзень адбудзецца выплата пенсій за 16 і 17 красавіка.

Паводле слоў спецыяліста, пенсіі за 1 мая будуць выплачаны на дзень раней — 30 красавіка. «Па графіку выплата пенсій у рэспубліцы з першага дня месяца пачынаецца толькі ў горадзе Мінску і Віцебскай вобласці (у астатніх рэгіёнах — на некалькі дзён пазней), — праінфармавала Валянціна Маліноўская. — Таму змяненне тэрмінаў выплаты пенсій за 1 мая закране толькі нязначную колькасць атрымальнікаў пенсій». У Фондзе сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацабароны адзначылі, што карэкціроўка графіка выплаты пенсій у сувязі са святочнымі і выхаднымі днямі — звычайная практыка. Гэта дае магчымасць забяспечыць пенсійныя выплаты за тыя дні, калі не працуюць паштовыя аддзяленні і банкаўскія ўстановы. Фінансаванне будзе праведзена своечасова і ў неабходным аб'ёме, запэўнілі ў фондзе.

Алена ПРУС, БЕЛТА.

СТРАХОВАЯ КОМПАНИЯ ПРОМТРАНСИНВЕСТ

ГОДОВОЙ БАЛАНС ЗАСО «ПРОМТРАНСИНВЕСТ» ЗА 2006 ГОД

220039 г. Минск, ул. Воронянского, 7А. Тел. (017) 222-75-49

УСПЕШНОЙ РАБОТЫ 14 ЛЕТ НА СТРАХОВОМ РЫНКЕ

млн.руб.

АКТИВ		ПАССИВ	
1	2	3	4
Основные средства	**5 427**	**Источники собственных средств, всего**	**6 484**
Нематериальные активы	**12**	в том числе :	
Финансовые вложения, всего	**113**	уставный фонд	2 860
в том числе:		резервный фонд	227
инвестиции в дочерние общества	-	добавочный фонд	3 156
инвестиции в другие организации	-	фонд накопления	49
облигации и другие долговые обязательства	113	фонд потребления	-
прочие финансовые вложения	-	целевое финансирование	-
Доля перестраховщиков в страховых резервах	**4 205**	нераспределенная прибыль-прошлых лет	-
Дебиторы, всего	**1 312**	нераспределенная прибыль отчетного года	192
в том числе:			
дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	133	**Страховые резервы и фонды, всего**	**12 617**
депо премий по рискам, принятым в перестрахование	-	в том числе: страховые резервы	12 219
дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	1 179	фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	375
Прочие активы, всего	**10 932**	гарантийные фонды	23
в том числе: незавершенное строительство	293	**Кредиторы, всего**	**1 901**
материальные ценности и затраты	458	в том числе: кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	197
денежные средства	9 084	кредиторская задолженность по операциям перестрахования	-
собственные акции (доли)	1097	депо премий по рискам, переданным в перестрахование	-
прочие активы	-	заемные средства	941
Непокрытые убытки прошлых лет	-	кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	763
Непокрытые убытки отчетного года	-	**Прочие пассивы**	**999**
БАЛАНС	**22 001**	**БАЛАНС**	**22 001**

ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ ЗАСО «ПРОМТРАНСИНВЕСТ» ЗА 2006 ГОД

млн.руб

НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЯ	Код строки	За отчетный период
1. Страхование жизни		-
Страховые взносы (премии)	010	-
Страховые выплаты	020	-
Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -)	030	-
Отчисления в гарантийный фонд	040	-
Расходы на ведение дела	041	-
Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)	050	-
2. Страхование иное, чем страхование жизни		
Страховые взносы (премии) — нетто перестрахование	064	24 596
Изменение резерва незаработанной премии — нетто перестрахование (+ или -)	067	-1 154
Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто перестрахование	082	12 309
Изменение резервов убытков — нетто перестрахование (+ или -)	092	-367
Изменение других технических резервов (+ или -)	100	-
Изменение иных страховых резервов (+ или -)	105	-
Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды	110	1 547
Расходы на ведение дела	120	8 187
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	671
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	122	88
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)	130	1 615
3. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы 1 и 2		
Операционные доходы	140	18 292
Операционные расходы	145	17 126
Внереализационные доходы	150	241
Внереализационные расходы	155	133
Финансовый результат	157	2 889
Использовано прибыли	158	2 697
Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)	170	192

В 2006 году компания сотрудничала с аудитором индивидуальным предпринимателем Ткач Светланой Ивановной. Юридический адрес: 220039, г. Минск, ул. Чайлытко, д. 20, кв. 64. Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления аудиторской деятельности № 02200 / 0060292 от 03.02.2004 г. выдана Министерством финансов Республики Беларусь со сроком действия по 02.02.2009 г. УНП 100990426. Свидетельство о государственной регистрации от 24.08.2000 г. № 955 выдано Минским горисполкомом. Аудиторское заключение: бухгалтерская (финансовая) отчетность ЗАСО «Промтрансинвест» достоверна, т.е. подготовлена таким образом, чтобы обеспечить во всех существенных аспектах отражение активов и пассивов ЗАСО «Промтрансинвест» на 1 января 2007 года и финансовых результатов его деятельности за 2006 год.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ВІКТАРА ЮШЧАНКУ АБВІНАВАЧВАЮЦЬ У ШАНТАЖЫ

Вярхоўная Рада Украіны спецыяльнай пастановай прызнала ўчора, што прэзідэнт краіны Віктар Юшчанка аказвае ціск на Канстытуцыйны суд. За азначаны дакумент прагаласавалі 256 дэпутатаў.

Акрамя гэтага, Рада таксама прыняла зварот да ўкраінскага народа, у якім гаворыцца, што Юшчанка «спрабуе шантажыраваць Канстытуцыйны і іншыя суды, спыніць работу парламента, абавязаць урад прымяніць незаконныя крокі». Украінскія парламентарыі таксама выказалі занепакоенасць магчымасцю грамадзянскага канфлікту і страты дзяржаўнасці, і заявілі аб тым, што пакідаюць за сабой магчымасць звярнуцца да міжнародных пасрэднікаў па дапамогу ў садзейнічанні вырашэнню палітычнай сітуацыі ў краіне. У суботу прэм'ер-міністр краіны Віктар Януковіч збіраўся выступіць на Майдане Незалежнасці перад прыхільнікамі Кааліцыі, але выступленне не адбылося. На мітынгу аб'явілі, што прэм'ер удзельнічае ў перагаворах «з мэтай урэгулявання сітуацыі ў краіне», але не патлумачылі з кім. Між тым стала вядома, што ў той дзень Януковіч наведаў футбольны матч нацыянальнага першынства паміж данецкім «Шахцёрам» і палтаўскай «Ворсклай».

МАРПЕХІ ДОБРА ЗАРАБІЛІ НА ЗНЯВОЛЕННІ

Брытанскія марскія пехацінцы, якіх 23 сакавіка захапілі ў палон узброеныя сілы Ірана і адпусцілі на волю 4 красавіка, хутчэй за ўсё нядрэнна заробяць на ўспамінах пра сваё зняволенне.

Брытанскае міністэрства абароны дало згоду на інтэрв'ю марпехаў для прэсы, што стала даволі незвычайным выпадкам у гісторыі зносінаў паміж СМІ і ваеннымі. Стала вядома, што за дэталёвыя расказы аб захопе, зняволенні, палоне, абыходжанні з імі і г. д. брытанскія салдаты могуць атрымаць па 70 тысяч фунтаў стэрлінгаў, а адзіная жанчына-ваенная, Фэй Церні, якая была сярод 15 захопленых маракоў, нават у два разы больш — 150 тысяч. Дарэчы, брытанскі таблоід The Sun пацвердзіў, што расплаціўся з брытанкай за яе інтэрв'ю.

СОТАЯ ЎНУЧКА

Сотая па ліку ўнучка нарадзілася ў 73-гадовага жыхара Кемераўскай вобласці (Расія) Аляксея Шапавалава.

Усяго ў расіяніна 49 унучак і 51 унук. Першы сын нарадзіўся ў яго сям'і амаль паўвека таму, потым на свет з'явіліся яшчэ 12 дзяцей — дзесяць сыноў і дзве дачкі. Аляксей Шапавалаў падкрэсліў, што ўсе члены яго сям'і вернікі, сам ён з'яўляецца настаяцелем царквы баптыстаў, таму ў яго дзяцей таксама па 10 і больш дзяцей. Ён падкрэсліў, што памятае ўсіх сваіх унукаў па імёнах. Усе сыны Аляксея Шапавалава жывуць з сем'ямі ў сяле Бунгур Новакузнецкага раёна на адной вуліцы.

У АДЫГЕІ ЎКРАЛІ 220 МЯШКОЎ СЕМАК

Трое невядомых у масках учынілі напад на тэрыторыю аднаго з сельскагаспадарчых вытворчых камбінатаў.

Пагражаючы расправай, яны звязалі двух вартаўнікоў, забралі 220 мяшкоў семак і зніклі. Крадзеж адбыўся на хутары Прагрэс Гіагінскага раёна Рэспублікі Адыгея. Урон ад яго ацэньваецца ў 600 тысяч расійскіх рублёў.

Дапамагчы Дзмітрыю можа кожны

Лыжная акрабатыка знешне — прыгожы, але вельмі рызыкоўны від спорту. 10 снежня 2006 года ў час падрыхтоўкі да аднаго з этапаў Кубка свету ў кітайскім горадзе Цзілінь беларускі спартсмен Дзмітрый Рак, удзельнік зімовых Алімпійскіх гульняў у Турыне, атрымаў сур'ёзную траўму. Доўгі час фрыстайліст знаходзіўся ў непрытомнасці. 1 лютага яго даставілі ў Мінск, у 5-ю клінічную бальніцу, 4-га красавіка перавялі ў Рэспубліканскую клінічную бальніцу «Аксакаўшчына» для далейшага лячэння і рэабілітацыі. Дапамагчы 30-гадоваму спартсмену спрабуюць з яго бядой можа кожны неабыякавы.

Атрымальнік: 3819382102369
Філіял 514 ААБ «Беларусбанк»
код 614
Мінск
Назначэнне плацяжу: Рак Дзмітрый Міхайлавіч для залічэння на рахунак № 00000010
Дзмітрый Рак

Падрабязную інфармацыю, на рахунак якога банка можна перавесці дапамогу ў расійскіх рублях і іншай валюце, вы можаце даведацца на сайце Нацыянальнага алімпійскага камітэта **www.noc.by.**

Ірына ПРЫМАК.

«Прамая лінія»

ЯКІЯ ХВАРОБЫ ПАГРАЖАЮЦЬ НАШЫМ ВАЧАМ?

Вядома, што каля 90 працэнтаў усіх ведаў аб навакольным свеце мы атрымліваем праз зрок. І страціць яго — вялікае няшчасце. Якія хваробы пагражаюць нашым вачам? Ці можна застрахавацца ад іх? Што рабіць, калі зрок пачаў падаць? На гэтыя і іншыя пытанні адкажа **кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт кафедры афтальмалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Галіна Раманаўна СЕМАК.** «Прамая лінія» з яе ўдзелам пройдзе ў рэдакцыі газеты «Звязда» ў сераду 11 красавіка з 15 да 16 гадзін па нумарах: (8-017) 292-38-92 і 292-38-21. ***Папярэднія пытанні можна задаць па тэлефонах: 287-18-29, 287-18-36.***

УП «Минский оптовый рынок»

(Минский район д. Таборы, 3-й км шоссе Минск—Гродно)

сдает в аренду складские площади.

Тел.: 279-40-71, 279-40-80, 279-40-70.

ISSN 1990-763X

9 771990 763008

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.04.2007 г. (для б/н разлікаў)	
1 долар ЗША	2 143,00
1 еўра	2 865,62
1 латвійскі лат	4049,13
1 літоўскі літ	829,78
1 чэшская крона	102,71
1 польскі злоты	746,33
1 расійскі рубель	82,47
1 украінская грыўня	426,47

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў	
Цэнтрабанк РФ	
USD	25,9846
10 UAH	51,3306
1000 BYR	12,0936
EUR	34,7102
Курс у гандлёвых кампаніях (на 9.04.2007 г.)	
USD	2140 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісацца на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Аляксандр Лукашэнка заклікае не дапусціць расколу паміж Беларуссю і Расіяй

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паводле яго слоў, мінулы год быў для беларусаў нялёгкі. «Ён «падарыў» нам вельмі жорсткі канфлікт з нашай самай блізкай дзяржавай. Гэта адбываецца пад дыктоўку асобных людзей, як прынята называць у Расіі — алігархаў, якія пачынаюць, як бухгалтары, лічыць: хто каму вінен. Прайшло зусім няшмат часу, і ў Расіі, і тут, у Беларусі, адчулі, хто каму сапраўды вінен», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Як заявіў Прэзідэнт, «мы ні ў якім выпадку не павінны, грунтуючыся на тым канфлікце, павялічыць тую трэшчыну і зрабіць раскол паміж нашымі народамі і дзяржавамі».

«Мы заўсёды з расіянамі, братэрскім рускім народам былі разам. І мы павінны заўсёды заставацца разам, як бы там некаму не хацелася па той або іншы бок барыкад. У нас хапае пагроз, і супраць гэтых пагроз мы заўсёды ў гісторыі былі разам і заўсёды будзем разам. Не прайшло і двух месяцаў, як мы адчулі гэтыя пагрозы. І ў Расіі зразумелі, што немагчыма змагацца супраць гэтых пагроз без беларусаў, якія заўсёды першымі станавіліся на абарону Айчыны. Так будзе заўсёды. Так Бог, напэўна, прадвызначыў нам. І мы гэтую ношу павінны несці», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Але галоўнае — гэты наймоцны ўдар па нашай эканоміцы, які быў нанесены з Усходу, намі пераадолены на працягу першага квартала. Мы ў стане падняцца на ногі. І мы падняліся. І паверце: у першым паўгоддзі гэтага года мы наогул забудзем, што гэта было. Усё дзякуючы таму, што вы заўсёды верылі ў тое, што мы з вамі рабілі», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка сказаў аб тым, што «як бы ні складвалася абстаноўка, беларусы вытрымаюць любы ўдар лёсу. Вытрымаем, таму што мы мужныя людзі. Я хачу, каб вы разумелі: мы нікому не навязваем волю, мы ні з кім не канфліктуем, я як кіраўнік дзяржавы ні на што не прэтэндую і не штурхаю свой народ пазіраць на чужыя землі. У нас хапае сваёй зямлі, сваіх праблем, якія трэба вырашаць. Дык чаго ж ад нас хочуць? Ад нас хочуць, каб мы змірыліся, скарыліся. Гэтага не будзе. Ніколі! Мы — горды, свабодалюбівы, незалежны народ, які жыве на сваёй зямлі. І так будзе заўсёды, таму што гэта прадвызначана Богам. І мы будзем за яе змагацца і адстойваць яе, — падкрэсліў Прэзідэнт.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка дадаў, што дзверы Беларусі заўсёды расчыненыя для тых, хто ідзе да нас з мірам і дабром. «І ў гэты светлы святочны дзень я аб гэтым гавару, таму што гэты дзень, калі адкрываюцца душы і сэрцы людзей і мы сардэчна гатовыя прыняць нашых сяброў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Сёння шмат розных «размоў» вядзецца ў мой адрас, у адрас кіраўніцтва Беларусі. Паверце: за гэты год нічога не змянілася. Прэзідэнт цвёрда стаіць на нагах і валодае сітуацыяй у краіне. Некаму хочацца, каб ён «захістаўся», але гэтага не будзе, таму што Бог нас заўсёды падтрымае ў нашым справядлівым імкненні жыць сумленна і прыстойна», — сказаў на заканчэнне Аляксандр Лукашэнка. У гонар святога свята Прэзідэнт перадаў у дар Свята-Духаваму кафедральнаму сабору карціну «Верхні горад». Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі перадаў Аляксандру Лукашэнку ад патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Аляксія II падарунак і найлепшыя пажаданні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Распрацоўваюцца дакументы па развіццю прадпрымальніцтва ў малых гарадах

Аб гэтым паведаміў першы намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Сямашка ў час наведвання прадпрыемстваў Жыткавіцкага раёна.

На яго думку, меры, прадугледжаныя ў гэтых дакументах, павінны стымуляваць развіццё малога бізнэсу. «У малых гарадах неабходна стварыць макраўмовы для развіцця бізнэсу. Перш за ўсё, для дзейнасці мясцовых прадпрымальнікаў трэба ствараць ільготныя ўмовы з мэтай прыцягнення яшчэ пакуль не задзейнічаных капіталаў», — сказаў Уладзімір Сямашка. Гэтыя ўмовы, лічыць ён, павінны быць прывабныя, напрыклад, і для расійскіх бізнэсменаў, якія маглі б частку сваіх сродкаў укласці ў развіццё праектаў.

Што ж датычыцца развіцця прамысловасці, то, як лічыць Уладзімір Сямашка, важна, каб у малых гарадах не было стратных прадпрыемстваў.

У час рабочай паездкі ў Жыткавіцкі раён Уладзімір Сямашка наведаў ААТ «Жыткавіцкі маторабудаўнічы завод», торфабрыкетны завод «Жыткавіцкае», а таксама Тураўскі гарвыканкам, дзе былі разгледжаны пытанні развіцця да 2010 года малых гарадоў — Жыткавіч і Турава.

Таццяна ШУР, БЕЛТА.

белагропромбанк
ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает, что 14 апреля 2007 года проводится внеочередное Общее собрание акционеров в заочной форме.

Место проведения – 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

Повестка дня:

1.Об утверждении единых условий заключения договоров финансовой аренды (лизинга), кредитных договоров и договоров залога с ОАО «Агролизинг» для приобретения основных средств в рамках планов закупок товаров (работ, услуг).

2. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи ЧУП «Озерицкий–Агро».

3. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи РУПЭ Минскэнерго «Минские тепловые сети».

4. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи республиканскому дочернему сельскохозяйственному предприятию (РДСУП) «ПСХ «Ченки» РАУП «Гомельское ПО «Кристалл».

5. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи Вильковскому Владимиру Николаевичу.

6. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи Управлению физической культуры, спорта и туризма Гомельского областного исполнительного комитета.

7. О внесении изменений в решение внеочередного Общего собрания акционеров от 14 сентября 2006 г., протокол № 9, «Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи».

8. О внесении изменений и дополнений в Положение о Ревизионной комиссии открытого акционерного общества «Белагропромбанк».

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 9 апреля 2007 года.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в учреждения ОАО «Белагропромбанк» по месту нахождения акционеров.

Дата окончания приема бюллетеней для заочного голосования — 12 апреля 2007 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 24 апреля 2007 года.

Телефон для справок: 8(017)2285303.

ДЗЯРЖЗАКАЗ З АДБОРАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пенсіянеры змяняюць адрас звароту

Наяўнасць медыцынскіх паказанняў плюс адсутнасць проціпаказанняў — гэтыя ўмовы санаторна-курортнага лячэння застаюцца ранейшымі. Між тым пытанне, дзе атрымаць пуцёўку, выклікала цікавасць заўсёды. Тым больш, што сёлета ў парадку размеркавання адбыліся пэўныя змены. Ці не асноўная з іх датычыцца пенсіянераў — зараз ім трэба звяртацца ўжо не ў органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, а да спецыялістаў Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленню і санаторна-курортнаму лячэнню па месцы прапіскі.

— Апроч таго, таксама праз падраздзяленні цэнтра па месцы прапіскі робіцца выдача пуцёвак прадпрымальнікам, якія плацяць узносы дзяржаўнага сацыяльнага страхавання ці якія вызвалены ад такіх узносаў, дзецям-сіротам і дзецям, што засталіся без апекі бацькоў, і дзецям-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў, — працягвае Генадзь Балбатоўскі. — У той жа час працуючыя грамадзяне павінны звяртацца ў камісіі па аздараўленню па месцы працы, ваеннаслужачыя і іншыя «сілавікі» — па месцы службы, а студэнты — па месцы навучання.

Застаецца дадаць, што прадастаўленне пуцёвак непаўналетнім дзецям здзяйсняецца па месцы работы, службы ці навучання аднаго з бацькоў, а непаўналетнім дзецям прадпрымальнікаў, якія плацяць сацстрах, — праз мясцовыя структуры Рэспубліканскага цэнтра.

Бацькі ў межах 10 працэнтаў

Аднак аб дзецях — гаворка асобная. Факт застаецца фактам: працяглы час з-за кепскага санітарнага стану і неадпаведнасці ўмовам бяспекі ў Беларусі штогод зачынялася як мінімум па пяць летніх аздараўленчых лагераў. Таму, да прыкладу, летась іх засталося 226. Аднак, заўважае Генадзь Балбатоўскі, сёлета стаіць задача максімальна захаваць гэтую лічбу — прынамсі, на падрыхтоўку летнікаў да сезона са сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання плануецца выдаткаваць 1 млрд рублёў.

Праўда, ці будуць захаваны ўсе 226 стацыянарных лагераў — яшчэ невядома. У любым выпадку ўсё будзе залежаць выключна ад вынікаў праверак. Тым больш, што патрабаванні да летнікаў больш мяккімі не стануць — кожная з гэтых устаноў павінна мець нармальную тэмпературу ў памяшканнях і гарачую ваду.

Плюс да таго, каб забяспечыць вартыя ўмовы, на працягу лета дзяцей будуць прымаць на аздараўленне санаторыі, прафілакторыі і турыстычныя цэнтры. Да слова, па традыцыі заезды распачнуцца ў пачатку чэрвеня. Пры гэтым застаецца правіла: за выключэннем дзяцей-чарнобыльцаў, сірот і дзяцей, што засталіся без бацькоўскай апекі, адзін школьнік зможа патрапіць у летнік толькі на адну змену. А ў сваю чаргу мінімальная працягласць апошняй вызначана ў 18 дзён.

Тым часам, паводле звестак Рэспубліканскага цэнтра, сёлета поўны сярэдні кошт пуцёўкі ў стацыянарны аздараўленчы лагер для дзяцей складзе 360 тыс. рублёў. Зразумела, што тут магчымы ваганні як у большы, так і ў меншы бок. Разам з тым можна заўважыць: звыш паловы гэтай сумы «кампенсуе» датацыя са сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання. Для кругластутачных лагераў сёлета яна павялічана на 10 тысяч і вызначана ў 185 тыс. рублёў на змену. І, дарэчы, аналагічная датацыя для дзённых лагераў складзе 70 тыс., а для профільных лагераў працягласцю 9 дзён — 80 тыс. рублёў.

Апроч таго, плануюцца дадатковыя датацыі па лініі асобных арганізацый і з мясцовых бюджэтаў. Такім чынам, зазначае Генадзь Балбатоўскі, памер непасрэдна бацькоўскай даплаты за пуцёўку для школьнікаў будзе вагацца ў межах 10 працэнтаў ад яе сабекошту.

Сяргей ГРЫБ.

Мінулыя начныя замаразкі не ўяўляюць пагрозы для пасеваў азімых і яравых

Такую думку выказаў вядучы навуковы супрацоўнік Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па земляробству Канстацін Шашко.

Каб зніжэння ўраджайнасці не адбылося, гаспадаркі рэспублікі, як толькі крыху пацяплее, павінны неадкладна ўнесці на гэтыя палі дадатковыя азотныя ўгнаенні. На думку спецыяліста, сёлетнія замаразкі больш небяспечныя для пасеваў азімых, якія знаходзяцца ў фазе выхаду ў трубку, чым для яравых.

Паводле слоў начальніка аддзела аграметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Надзеі Мельчаковай, у найбольш халодныя ночы 5 і 9 красавіка тэмпература паветра паніжалася да мінус 6 градусаў, а ў асобных раёнах Віцебскай і Магілёўскай абласцей да мінус 7. На вышыні 2 см ад паверхні глебы на Палессі месцамі тэмпература паветра апускалася да мінус 10 градусаў, што ўяўляе рэальную пагрозу для азімых збожжавых культур, якія выйшлі ў трубку.

Спецыялісты-практыкі настроены больш аптымістычна. Паводле слоў намесніка міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Васіля Паўлоўскага, стан азімых і ранніх яравых пакуль не выклікае апасенняў. Пашкоджанняў пасеваў няма. Улічваючы, што начныя замаразкі непрацяглыя, гібелі раслін яны не выражаюць.

У цяперашні час, нягледзячы на халаднаватае надвор'е, гаспадаркі працягваюць сяўбу яравых збожжавых. Да 10—12 красавіка яе завершаць гаспадаркі паўднёвай зоны рэспублікі, да 13 красавіка справяцца з сяўбой збожжавых сельгасарганізацыі цэнтральнай зоны, а да 15 красавіка — паўночныя рэгіёны краіны. Калі халоднае надвор'е будзе трымацца, сяўбу кукурузы гаспадаркі рэспублікі пачнуць 20 красавіка. У выпадку пацяплення — 15 красавіка, але не раней, падкрэсліў намеснік міністра. Паводле яго слоў, у цяперашні час вельмі важна аператыўна рыхтаваць глебу да сяўбы і кантраляваць сітуацыю на палях з азімымі.

Таццяна ЛОБАС, БЕЛТА.

ЖАНЧЫНА З РУЖЖОМ

У доме беспрацоўнай жыхаркі вёскі Бабінавічы Лёзненскага раёна супрацоўнікі крымінальнага вышуку знайшлі і канфіскавалі гладкаствольнае ружжо нестандартнага калібру — 8,9 міліметра. Відаць, яно было зроблена нейкім майстрам, бо зброя не заводскай вытворчасці.

Высветлілася, што 22-гадовай жанчыне ружжо яшчэ летась «аддаў пад ахову» знаёмы — жыхар вёскі Адаменкі 1984 года нараджэння, рабочы сельскагаспадарчай арганізацыі. Узбуджана крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Крымінал, здарэнні

УЦЯКАЧ ЗНІК У ЛЕСЕ

З усіх ног кінуўся ў лес вадзіцель «Джыпа-Чэрокі», калі ўбачыў супрацоўнікаў Маларыцкага РАУС і Пінскага пагранатрада, што накіроўваліся да машыны.

Гэтае здарэнне адбылося каля вёскі Высокае. Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Брэсцкага аблвыканкама, кінуты аўтамабіль аказаўся без дзяржаўных нумароў. А вось у салоне машыны праваахоўнікамі было знойдзена 85 рулонаў тканіны, агульны кошт якой ацэньваецца ў 90 мільёнаў рублёў. Зараз па гэтаму факту праводзіцца праверка, высвятляецца асоба гаспадара грузу.

АТАВАРЫЛІСЯ ЗА ФАЛЬШЫЎКІ

Непрыемна здзіўлена была прадавец магазіна «Тавары паўсядзённага попыту», што ў вёсцы Орлева Любанскага раёна, калі пералічвала грашовую выручку: сярод купюр яна знайшла дзве банкноты па 10 тысяч рублёў, якія былі несапраўднымі.

Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, праваахоўнікам спатрэбілася менш за гадзіну, каб затрымаць падазроных ва ўчыненні гэтага злачынства. Супрацоўнікі АДАІ ў гэтай жа вёсцы праверылі 22-гадовага і 25-гадовых жыхароў Салігорска: у іх аўтамабілі «Таёта» было знойдзена і канфіскавана 37 аналагічных купюр з аднолькавымі серыйнымі нумарамі. Як высветлілася, купюры былі выраблены спосабам струйна-кроплевага друку, на іх таксама адсутнічалі вадзяныя знакі.

Ігар ГРЫШЫН.

МОЙ ДОМ — МАЯ КРЭПАСЦЬ?

У Пружанах міліцыя завяла крымінальную справу на пенсіянера, які нанёс цяжкую траўму няпрошанаму госцю.

Вечарам стары ўбачыў, што ў яго хату праз акно нехта лезе. Схапіўшы палку (першае, што трапіла пад руку), пенсіянер стукнуў рабаўніка па галаве, які атрымаў чэрапна-мазгавую траўму і апынуўся ў бальніцы.

Аказалася, што гаспадар дома перавысіў меру дапушчальнай самаабароны (вельмі моцна стукнуў злодзея) і цяпер можа апынуцца на лаве падсудных. Адным словам, калі да вас праз вакно нехта ноччу лезе, пастарайцеся яго ўгаварыць не рабіць гэтага і не біце па галаве. А інакш — турма?!

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

РАБЫНІ КРАІНЫ ЎЦЕХ

Ва Упраўленне наркакантролю і процідзеяння гандлю людзьмі МУС з Камітэта дзяржбяспекі паступіла інфармацыя аб тым, што ў адной з кватэр па праспекту Незалежнасці ў Мінску дзейнічае падпольная студыя па вырабу прадукцыі парнаграфічнага зместу. У ходзе праверкі па ўказанаму адрасу аператыўнікі затрымалі грамадзяніна Расіі. Падчас вобыску былі канфіскаваны фота- і відэаапаратура, камп'ютар, фотаплёнкі і лічбавыя носьбіты інфармацыі парнаграфічнага зместу.

Як патлумачылі ва Упраўленні наркакантролю і процідзеяння гандлю людзьмі МУС, дзяўчаты для здымак набіраліся ў ВНУ краіны, дзе перыядычна з'яўляліся аб'явы з прапановай сімпатычным дзяўчатам паўдзельнічаць у масавых сцэнах на тэлебачанні, а таксама ў кастынгах для розных кінапраектаў. Пасля прыходу на фотавідэасесію ўгаворамі або абяцаннем нядрэнных ганарараў іх уцягвалі ў здымкі, зместу якіх адносіўся да парнаграфіі.

Схема дзейнасці затрыманага, які спачатку назваўся прыватным фатографам, была простая. Раз у паўгода ён прыязджаў у Мінск, дзе спыняўся ва ўжо знятай па вуснаму дагавору кватэры. На працягу месяца ён «працаваў», пасля чаго «выстаўляў» сваю «прадукцыю» на продаж для далейшага распаўсюджвання ў сетцы Інтэрнэт, эратычных і парнаграфічных замежных выданнях, а таксама для «калег» па «відэапяру».

Сапраўднымі памерамі прыбытку «мастака» займаюцца кампетэнтныя органы, а вось узнагароджанне дзяўчат магло быць ад 20 умоўных адзінак і вышэй — у залежнасці ад характару і накіраванасці здымак. Некаторым пасля ацэнкі спажыўцом прапаноўвалася далейшае супрацоўніцтва ды дадатковыя «прэміяльныя». Такім чынам дзяўчаты ўцягваліся ў сэкс-індустрыю, што прадугледжвала далейшую работу ў гэтай сферы за мяжой. Пакуль жа дзеянні расіяніна кваліфікуюцца, згодна з арт. 343 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, як «распаўсюджванне парнаграфічных матэрыялаў або прадметаў», за што прадугледжана адказнасць ад штрафу і двухгадовых папраўчых работ да арышту на тры месяцы або абмежавання волі на год.

Аляксей ЦІТОЎ.

АДКРЫЎСЯ БАЙКЕРСКІ СЕЗОН

У Віцебску байкеры з Беларусі і Расіі адкрылі чарговы сезон

Каб узяць удзел у гэтай незвычайнай акцыі, у горад над Дзвіной на сваіх матацыклах прыехалі байкеры з Мінска, Смаленска, Брэста і іншых гарадоў. Ля культурна-дзелавога цэнтра «Віцебск» усе ахвотнікі маглі не толькі дакрануцца да моцных цуда-матацыклаў, якія мадэрнізаваны ўласнымі рукамі байкераў, але і апынуцца ў сядле… на месцы пасажыраў.

Праводзіліся конкурсы на самую віртуозную язду, самую марудную і іншыя. Цікава, што мясцовая ДАІ не толькі падтрымала правядзенне байкерскага свята, але і ва ўсім дапамагала яго арганізатарам.

У апошнія гады на Віцебшчыне байкерскі рух вельмі актыўна развіваецца. Ёсць сярод байкераў і дзяўчаты, людзі розных узроставых і прафесій. Нават сярод дзяржаўных служачых ёсць байкеры.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Фота БЕЛТА.

Спорт-тайм

Медалі на татамі

На чэмпіянаце Еўропы ў Бялградзе беларускія дзюдаісты Сяргей Шундзікаў (вага да 81 кг) і Канстанцін Сямёнаў (73 кг) прынеслі нашай камандзе адпаведна сярэбраны і бронзавы медалі. Кантынентальнае першынство з'яўляецца адным з 12 топ-турніраў, дзе адбываецца адбор на Алімпіяду-2008 у Пекін.

Двайны ўзлёт

На этапе Кубка свету па скачках на батуце ў канадскім Квебеку беларусы Мікалай Казак і Уладзімір Какорка выйгралі сярод мужчынскіх дуэтаў у «сінхроне». Пара Таццяна Пятрэня і Кацярына Міронава стала другой у спаборніцтве жанчын.

Грабоўскага падвёў... канёк

Нападаючы нацыянальнай зборнай Беларусі па хакею і клуба АХЛ «Гамільтан Бульдогз» Міхаіл Грабоўскі выбыў з гульні прыкладна на два тыдні з-за траўмы рукі, якую атрымаў, калі паслізнуўся ў раздзявальні, параніўшы яе аб лязо канька. Іграку была зроблена аперацыя і накладзены гіпс.

Адна каманда

Учора ў Мінску пачаўся незвычайны турнір па міні-футболу.

Паводле слоў **супрацоўніка прэс-службы ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандра ЛАСТОЎСКАГА**, адметнасць спаборніцтваў у тым, што ў іх прымаюць удзел цяжкія падлеткі і міліцыянеры. У складзе кожнай з 9 каманд будуць па 8 хлапчукоў, якія знаходзяцца на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх, і па 2 курсанты Акадэміі МУС.

Як сведчыць вопыт аналагічных мінулагодніх турніраў, на футбольнай пляцоўцы ўсталёўваюцца даверлівыя адносіны паміж вартавымі правапарадку і цяжкімі падлеткамі. Такі нефармальны спосаб кантактавання з міліцыянерамі аказвае станоўчы ўплыў не толькі на непасрэдных удзельнікаў спаборніцтваў, але і садзейнічае прафілактыцы падлеткавай злачыннасці ўвогуле, бо прыцягвае ўвагу грамадскасці да гэтай праблемы.

Ад ДАІ не збяжыш

Сітуацыя

Вадзіцелі, якія пасля ўчынення аварыі знікаюць з месца здарэння, марна спадзяюцца, што застануцца беспакаранымі. Нават, калі ўцекачы старанна «замятаюць» сляды, рана ці позна міліцыя іх знаходзіць, і тады даводзіцца несці адказнасць па ўсёй строгасці закона…

Жыхар Заслаўя В. не меў вадзіцельскага пасведчання. Тым не менш хлопец сеў за руль старэнькіх «Жыгулёў». А каб не трапіць на вочы супрацоўнікам ДАІ, вырашыў трымацца далей ад цэнтральнай часткі горада, ноччу прабіраўся па вузкіх закавулках. Для няўмелага кіроўцы сама па сабе такая дарога была няпростай, а тут яшчэ нечаканая перашкода: ля аднаго з прыватных дамоў была прыпаркавана іншамарка. В. спрабаваў яе аб'ехаць, але нават для такога няхітрага манеўру не хапіла майстэрства і ягоныя «Жыгулі» пратаранілі «Нісан». Пачуўшы шум сігналізацыі, з дому выбегла гаспадыня іншаматкі, але віноўнік аварыі ўжо знік з месца здарэння. Разумеючы, што ягонае аўто будуць шукаць, В. вырашыў схаваць «Жыгулі» ў дварэ дома сваёй цёткі. Там ён накрыў машыну чорнай цыратай і нават прысыпаў смеццем. Міліцыянерам спатрэбілася 26 дзён, каб знайсці гэты аўтамабіль і няўдалага кіроўцу. Зараз уцекачу давядзецца адказваць і за ДТЗ, і за ўцёкі з месца здарэння, і за кіраванне транспартным сродкам без правоў.

А вось яшчэ адна павучальная гісторыя. Праўда, з трагічным фіналам...

Аляксандр быў, як кажуць, на сёмым небе ад шчасця. Нарэшце збылася ягоная мара: ён стаў уладальнікам уласнага аўтамабіля. Для звычайнага ўрача сабраць патрэбную суму грошай нават на патрыманы «Опель» было няпроста. Таму новаспечаны аўтааматар не мог нацешыцца сваёй «ластаўкай» сам і яшчэ захацеў падзяліцца радасцю з калегамі. Увечары ён вясёлы і шчаслівы вяртаўся дамоў, дзе чакалі жонка і маленькі сын. Да дому заставалася ўсяго некалькі кварталаў, як раптам на шляху быццам з-пад зямлі з'явіўся моцна п'яны чалавек. Аляксандр не паспеў затармазіць і збіў нецвярозага пешахода. Ён быў яшчэ жывы, таму вадзіцель уладкаваў параненага ў салоне свайго аўто і павёз у бліжэйшы шпіталь. Аднак па дарозе пасажыр памёр і Аляксандр вырашыў змяніць свой маршрут. Ён адвёз труп у лесапарк, пасадзіў на лавачку, а потым перагнаў свой пашкоджаны «Опель» у двор аднаго з дамоў. Праз некаторы час Аляксандр паведаміў у міліцыю, што выгульваў сабаку і знайшоў у лесапарку труп мужчыны. Але ж нездарма кажуць, што ўсё патаемнае становіцца відавочным. Ужо праз тыдзень міліцыя расставіла ўсе кропкі над «і» ў гэтай гісторыі. Неўзабаве гора-вадзіцель апынецца на лаве падсудных.

Дарэчы, за 3 месяцы гэтага года ў Беларусі з месцаў ДТЗ зніклі 43 вадзіцелі, аднак пераважная большасць уцекачоў была знойдзена і прыцягнута да адказнасці.

Сяргей ЧЫЖЫК,
намеснік начальніка службы ДПС «Страла» МУС Беларусі.

Пытальнік

Чэкі, абмененыя на акцыі прадпрыемства, вярнуць назад ужо немагчыма

Мы з жонкай абодва пенсіянеры, абодва — малалетнія вязні. Гадаваўся я без бацькі (ён загінуў у 1941 годзе), у свае 8 гадоў ужо ўмеў араць, сеяць, выконваць іншую работу. Але такой долі не хацеў бы ні для дзяцей, ні для ўнукаў. Мая дачка жыве ў Мінску, мае траіх дзяцей. У чаргу на кватэру яны сталі ў 1987 годзе ў выканкаме і па месцы працы… Мы атрымалі чэкі «Жыллё» і «Маёмасць» і вырашылі дачцэ дапамагчы. Нам параілі чэкі «Жыллё» перааформіць на чэкі «Маёмасць», мы так і зрабілі і перавялі іх на дачку… Яна абмяняла іх на акцыі электрарамонтнага завода, аднак дывідэндаў ні разу не атрымала. У 2003 годзе ім па месцы працы мужа прапанавалі будавацца, яны пагадзіліся. Мы звярнуліся на завод, каб вярнуць чэкі. Дырэктар заяву падпісаў, але бухгалтар адмовілася ставіць пячатку, сказала, што чэкі не вернуць… Акцыі завода дачка не мае, 27 акцый знаходзяцца на прадпрыемстве. Зараз сям'і дачкі трэба штомесяц плаціць за кватэру 200 тысяч рублёў, дзеці падраслі, іх трэба апранаць, вучыць за свой кошт. Дапамажыце нам, калі ласка.

М.В. ШАБЛІНСКІ,
в. Віша Светлагорскага раёна.

Кампетэнтны адказ на запыт чытача па просьбе «Звязды» даў **Фонд дзяржаўнай маёмасці Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь**.

«Як вынікае з вашага ліста, налічаныя вам чэкі «Жыллё» ў сувязі з немагчымасцю іх выкарыстання для прыватызацыі жылога памяшкання вы пераафармілі на чэкі «Маёмасць». Нявыкарыстаныя чэкі «Маёмасць» вы маглі, у адпаведнасці з Палажэннем аб парадку пераафармлення чэкаў «Маёмасць» на чэкі «Жыллё», пераафарміць назад на чэкі «Жыллё». Згодна з Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 чэрвеня 2005 года № 6 «Аб упарадкаванні абарачэння і выкарыстання імянных прыватызацыйных чэкаў «Жыллё», з 1 студзеня 2007 года спынена выдача чэкаў «Жыллё», адпаведна, спынена і пераафармленне чэкаў «Маёмасць» на чэкі «Жыллё».

Аднак вы свае чэкі «Маёмасць» падарылі дачцэ, якія яна абмяняла на належныя дзяржаве акцыі ААТ «Электрарамонтны завод» г. Мінска і стала акцыянерам гэтага таварыства. Набываючы ў дзяржавы акцыі названага акцыянернага таварыства, ваша дачка заключыла дагавор, у адпаведнасці з якім прадавец абавязаўся перадаць ёй акцыі, а яна абавязалася аплаціць гэтыя акцыі шляхам пералічэння чэкаў «Маёмасць» на спецыяльны чэкавы рахунак прадаўца. **Усе абавязацельствы бакоў па дагавору былі выкананыя. Ні заканадаўствам аб прыватызацыі, ні дагаворам не прадугледжана падстаў для скасавання выкананага дагавора і вяртання чэкаў «Маёмасць». Чэкі «Маёмасць», пералічаныя вашай дачкой у лік аплаты за акцыі, лічацца выкарыстанымі і выведзенымі з абарачэння** (выдз. — **Рэд.**).

Згодна з заканадаўствам аб каштоўных паперах, акцыі ў Рэспубліцы Беларусь выпускаюцца ў бездакументальнай форме — у выглядзе запісаў на рахунках. Улік, захоўванне і разлікі па аперацыях з каштоўнымі паперамі (акцыямі) ажыццяўляюць спецыялізаваныя арганізацыі, што называюцца дэпазітарыямі каштоўных папер.

Улік і захоўванне акцый ААТ «Электрарамонтны завод» вядзе дэпазітарый ЗАТ «Агракапітал», па звестках якога ваша дачка ўнесена ў рэестр акцыянераў, і на яе рахунку «дэпо» лічыцца 27 акцый ААТ «Электрарамонтны завод».

Рэха публікацыі

ЗЁЛКІ І НАРОДНЫЯ ЛЕКІ — ДЛЯ СЭРЦА І САСУДАЎ

Парады траўніцы і лекаркі з Мсціслава

Публікацыя ў газеце матэрыялаў, якія датычаць нашага здароўя, заўсёды выклікае ў чытачоў практычны інтарэс — як дапамагчы сабе ў той ці іншай сітуацыі. Так здарылася і пасля апублікавання ў «Звяздзе» за 27 сакавіка матэрыялу «Трэба любіць сябе і жыццё» — пра траўніцу з Мсціслава Ганну Сазанкову. Сёння яна дае парады тым, хто даслаў ці задаў па тэлефоне найбольш тыповыя пытанні — якія зёлкі карысна ўжываць для сардэчна-сасудзістай сістэмы?

— Сэрца і сасуды я называю «асноўнай мішэнню» нашага арганізма, — гаворыць Ганна Сазанкова. — Менавіта на іх перш за ўсё адбіваюцца дрэнныя эмоцыі і злыя словы. Нездарма гавораць — «сэрца баліць». Альбо «сэрца гарыць» — ад таго, што гэты орган востра рэагуе на эмоцыі, гэта цэнтр суперажывання.

Ёсць шмат зёлак, запэўнівае траўніца, якія дапамогуць, падтрымаюць і падправяць тое, што парушана.

Напрыклад, **глог крывавачырвоны**. Ён і танізуе сардэчную мышцу, і рэгулюе рытм сэрца, і ліквідуе аритмію, і змяшчае ўзбуджальнасць, паляпшае кровазварот і сон, і робіць яшчэ шмат чаго карыснага для сэрца, асабліва для састарэлых людзей.

— Збіраць кветкі глогу складана, бо цвіце ён толькі 3—5 дзён, — расказвае Ганна. — Але калі падгадаеце, то вельмі добра зрабіць з кветак глогу настойку: 10 грамаў кветак на 100 грамаў гарэлкі, настойваць два тыдні і захоўваць у халаднаватым і цёмным месцы. Ужываць настойку наступным чынам: 10—15 кропель тры разы на дзень за паўгадзіны да яды.

Збіраць кветкі глогу трэба так, каб завязаліся і плады, якія таксама карысныя. Сазанкова вучыць: 1 сталовая лыжка высушаных і раскрышаных пладоў глогу на шклянку кіпеню, захутаць, каб добра настаялася, і піць па паўшклянкі 2—3 разы на дзень. Таксама можна ўжываць глог і для прыгатавання травяной гарбаты: пітво атрымае смакавае адценне разынак.

— У агародах часта расце **каліна**, і нават яе семачка ў форме сардэчка паказвае, што каліна — вялікая памочніца нашаму сэрцу, — працягвае лекарка. — Яна дзейнічае супраць арытміі, дыстаніі, гіпертаніі і супакойвае неўрозы.

Ганна гаворыць, што ягады каліны можна ўжываць па-рознаму: і сок піць, і настоі гатаваць. Сушыць каліну трэба ў духоўцы пры 80 градусах, і потым прыадчыніць дзверцы. Такі ашчадны рэжым для таго, каб ягады не счарнелі.

— Але самае галоўнае — гэта не ягады, а кара каліны, — вучыць Сазанкова. — Яе збіраюць ранняй вясной: якраз цяпер — перад тым, як з'явіцца першыя лісткі. І абдзіраць кару трэба не поўнасцю, а з бакавых пабегаў, асцярожна.

Морква — адзін з самых даступных караняплодаў.

— А **насенне морквы** можна з поспехам выкарыстоўваць супраць стэнакардыі і атэрасклерозу, — працягвае Ганна. — Нават навука ўзяла гэтую лекавую ўласцівасць звычайнай для нас расліны на ўзбраенне і ўжо ёсць адпаведны прэпарат.

Траўніца раіць у хатніх умовах рабіць так: **чайную лыжку насення морквы заліць 300 грамамі кіпеню, захутаць і даць пастаяць гадзіну 6. Піць па трэць шклянкі на дзень. Аднак пачынаць трэба з меншай дозы: як і да любых сардэчных лекаў, папярэджвае Ганна, трэба, так бы мовіць, прымерыцца.**

Калі пасмажыць корань **дзьмухаўца**, то атрымаецца цудоўны напой: нешта накшталт кавы, але без кафеіну. Гэты рэцэпт з вопыту мсціслаўскай траўніцы — для тых, каму нельга ўжываць кафеін, але кавы вельмі хочацца.

— Але смак кавы — гэта толькі кулінарная ўласцівасць дзьмухаўца, — зазначае яна. — А лекавая ўласцівасць — памяншэнне халестэрыну ў крыві. У лістах і кветках шмат вітаміну B_1. І для агульнага ўмацавання арганізма дзьмухавец вельмі карысны.

Сок дзьмухаўца могуць, шчыра кажучы, ужываць толькі людзі моцнага характару, таму што ён вельмі горкі. Тым не менш, і вельмі карысны для нармалізацыі водна-салявога абмену. 200 мл соку ў дзень, але не за адзін раз — такая доза здымае ацёкі. Для таго, каб зрабіць сок больш-менш прыдатным для ўжывання, трэба спачатку патрымаць расліны ў халоднай падсоленай вадзе, потым зялёную масу працерці праз мясарубку ці сокавыціскалку. Такі сок можна толькі 2—3 дні захоўваць у халадзільніку. Дарэчы, папярэджвае Сазанкова, ад соку дзьмухаўца можа быць расстройства жывата, але нічога страшнага тут няма — толькі ачысціць арганізм.

Трыпутнік — гэта зёлка-ўніверсал, лічыць лекарка. У дзяцінстве, збіўшы каленкі, мы ранкі нават не мылі, а адразу прыкладвалі лісты трыпутніку, якія раслі звычайна пры дарозе. І гэта зёлка сапраўды чысціць раны ад бруду і спрыяе іх зажыўленню.

— Трыпутнік выкарыстоўваецца не толькі пры

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-3

Класіфікацыйны конкурс з нормай першага спартыўнага разраду па шашках пад такой назвай працягвае заданне № 7:



БЕЛЫЯ: b6, c7, d6, e5, f4, h6 (6). ЧОРНЫЯ: a7, b2, d2, f2, h4, h8 (6). Выйгрыш.

Пераможцаў чакаюць прызы Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (дырэктар Канстанцін Міхайлавіч БАРЭЛЬ). Гэты калектыў — арганізатар конкурсу —прысвячае яго 90-годдзю газеты «Звязда».

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».

РАШЭННІ, ВОДГУКІ

Праверце, калі ласка, рашэнні змешчаных раней пазіцый.

«НОВЫ ГОД — НОВЫ КОНКУРС (М. Грушэўскі)): 1. bc7 2. dc3 3. cd8 dc3ABC 4. de7 5. h:h4x. C3. ...de3 4. de7 5. h:h4x. B3. ... gf2 4. de7 5. h:g1x. A3. ... gh2 4. de7 5. h:g11#.

З ПАРТЫЙ ЮНІЁРАЎ (А. Рык—В. Сарокін): 1. ... dc5 2. ... fg5 3. ... ba3 4. ... a:a3x. «Чортава кола»!

Рашылі: А. Булаўка (Новалукомль), А. і І. Ашыхміны і У. Ціханаў (п/а Рудаўка Нясвіжскага раёна), У. Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), А. Пярхальскі (Глыбокае), В. Белы (Калінкавічы), І. Астроўскі (Мінск), Аляксандра Камінская і А. Рогач (Вілейка), В. Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), А. Янчук і яго вучні Дзіяна Шаўчук, Дзяніс Семянюк, Павел Ліцкевіч, Надзея Ермаловіч і Валерый Жук (Камянец), У. Аўласенка (Гродна), С. Нячаеў (Баранавічы), В. Голас (Любань), А. Агіевіч (Кобрын), П. Шклудаў (Наваполацк). А вось А. Кіслы (Узда), І. Працук і У. Пушкін (Паставы), А. Перавознікаў і У. Сапяжынскі (Рагачоў), В. Януковіч (г. п. Варапаева Пастаўскага раёна), В. Грабенка і С. Гурыновіч (Мінск), С. Цімафееў (Барысаў), І. Козел (п/а Махнавічы Мазырскага раёна), І. Мацкевіч (Жодзіна), В. Гаўрыш (в. Навасёлкі-1 Пастаўскага раёна) заўважылі пабочную развязку (1. cd4x), зарабілі па аднаму дадатковаму ачку і ўзначалілі конкурсную табліцу.

Палясоўшчыку Пастаўскага лясгаса Віктару Януковічу найбольш складаныя шашачныя сітуацыі дапамагае развязваць лірычная музыка.

«ЦУГЦВАНГ»

Аб выніках чэмпіянату краіны па шашках-64 у першай лізе мы паведамлялі ўжо. Сёння пазнаёмцеся з фрагментам партыі пераможцы гэтага спаборніцтва Мікалая Кадзеснікава — майстра ФМЖД з Бабруйска.



БЕЛЫЯ (М. Кадзеснікаў): a3, a5, b2, c3, d2, d4, e3, f2, f4, h2 (10). ЧОРНЫЯ (Сяргей Бурко — кандыдат у майстры спорту з Оршы): a7, b6, b8, c5, c7, d6, f6, g5, h4, h6 (10). Белыя маглі перамагчы празаічна (1. de5 2. c:e5x), але выравшалі бліснуць рэдкім у шашках прыёмам «цугцванг». Паспрабуйце зрабіць гэта і вы. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

«ВАРЯГ-ПРЕСС»-7

Рэдакцыя газеты «Варяг-Пресс» правадзіць сёмы міжнародны конкурс па складанні мініпраблем, праблем, эцюдаў і задач-64. Усяго можна выслаць 16 задумак — па чатыры ў кожны раздзел. Пераможцы і прызёры ў кожным з іх вызначаюцца па суме ацэнак трох лепшых твораў і адзначаюцца рэдакцыяй газеты. Свае творы, новыя ці апублікаваныя пасля 15 красавіка 2006 года (указанне месца і часу першай публікацыі абавязкова) і якія не ўдзельнічалі ў іншых спаборніцтвах, накіроўвайце да 15 красавіка 2007 года на адрас: 225710, г. Пінск, а/с 5, А. І. Кагоцьку.

Судзейства ажыццяўляецца па Кодэксе шашачнай кампазіцыі Беларусі 2004 года.

ЛАЎРЭАТЫ, ВЫБРАННІКІ

Шляхам галасавання членаў ГА «Беларуская федэрацыя шашак» прызнаны лепшымі: спартсменам па шашках — Ігар Міхальчанка (Ваўкавыск), іграком-адкрыццём 2006 года — Андрэй Мацявін (Слонім), трэнерам — Кірыл Хайнюк (Мінск), суддзёй — Сяргей Насевіч (Мінск), арганізатарам турніраў — Аляксандр Аніська (Слонім) і журналістам на шашачную тэму — Віталь Варушыла (газета «Спор-тивная панорама»). Дарэчы, дыплом намінанта атрымаў і аўтар гэтых радкоў, як вядучы звяздоўскай рубрыкі «Шашкі».

А дэлегаты канферэнцыі ГА «БФШ» выбралі старшыню выканкама федэрацыі — зноў віцэ-чэмпіёнку свету па шашках-100 Ірыну Пашкевіч, яе намеснікамі — арбітра ФМЖД Аляксандра Аніську, які будзе курыраваць прапаганду шашак-64 і надалейшае іх развіццё ў нашай рэспубліцы, і міжнароднага гросмайстра Сяргея Насевіча (шашкі-100), а таксама адказнага сакратара — майстра спорту Паўла Шацава.

БАКЛАЖАНЫ СПЕЮЦЬ У ПОЛАЦКУ

У гандлёвую сетку Полацка паступілі першыя беларускія баклажаны. Яны вырашчаны ў новых цяпліцах філіяла РУП «Віцебскэнерга» — «Вясна-энерга» (Полацкі раён), паведаміла карэспандэнту БЕЛТА намеснік дырэктара філіяла, кіраўнік цяплічнага комплексу Галіна Паўлючэнка.

Попыт на баклажаны пры цане ў гандлёвай сетцы амаль Br8 тыс. за кілаграм вялізны, адзначыла кіраўнік. «Вясна-энерга» стала першым у Віцебскай вобласці цяплічным камбінатам, які асвоіў тэхналогію вырошчвання гэтай паўднёвай культуры. Пад баклажанамі занята 0,25 га, і збіраць іх тут плануюць да восені.

Фота Аляксандра Хітрова, БЕЛТА

Цяплічніца Алена РАБЕНКІНА.

Крымінал

ВЫШУКВАЕЦЦА ДРЫВАСЕК

Супрацоўнікамі міліцыі Мінскай вобласці ўзбуджана крымінальная справа па факту незаконнай высечкі лесу на тэрыторыі Нацыянальнага парку «Нарачанскі».

Паводле звестак аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, невядомы пакуль дрывасек незаконна нарыхтаваў больш за 56 кубаметраў лесу, прычыніўшы ўрон дзяржаве амаль на 11 мільёнаў рублёў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Няўдалы «ваяж» у Піцер

Мой стрыечны брат Анатоль вярнуўся з, прама скажам, вельмі няўдалага ваяжу на заробкі ў Піцер. Але вопыт ёсць, як некалі казаў адзін гумарыст. Ёсць у яго і цікавыя назіранні. Таму пагаворым.

— Анатоль, як увогуле выспела такое рашэнне — паехаць у Піцер?

— Я ж усё жыццё будаўнік. Таму прачытаў у газеце аб'яву аб наборы рабочых у Санкт-Пецярбург. Умовы, бачна, прыстойныя. Фірма-пасрэднік салідная. Дазваніўся, заключыў дамову. Заплаціў нейкія грошы за пасрэдніцтва — і вось ужо на «Ікарусе», нас, кантрактнікаў, павезлі ў паўночную сталіцу Расіі. Павезлі бясплатна, за кошт фірмы. Па дарозе ўжо здарыўся эпізод, які павінен быў насцярожыць, падказаць: не пашанцуе табе, мужык. У Апоч-цы спыніліся, я выйшаў пашукаць гэта самае месца. А тут два міліцыянеры. Запытаўся ў іх. А яны запатрабавалі пашпарт і рэгістрацыю, рэгістрацыю нам жа абяцалі там, у Піцеры. У іх адно: сто рублёў штрафу. У мяне было пяцьсот расійскіх, але адной банкнотай. «Няма», — кажу. А ён стаў гартаць пашпарт. І я ўспомніў, што пяцісотка там. Знайшоў, забраў, аддаў пашпарт — і бывай. Потым расказалі, што яны спецыяльна «пасуць» аўтобусы з кантрактнікамі, каб «падаіць». Дарэчы, і ў Піцеры міліцыя таксама «пасла» аўтобусы, якія перавозілі рабочых з аб'екта да жылля ці наадварот.

— І як сустрэў Санкт-Пецярбург?

— Вельмі прыстойна. Усё было па ўмовах дагавору. Вось толькі адно мы не прадбачылі. Назва фірмы была напісана па-англійску. А яна аказалася турэцкай. І нашу групу раскідалі па турэцкіх брыгадах. Мяне далучылі да двух туркаў, якія ні слова не ведалі па-руску. Калі было трэба паразумецца — у ход ішлі пальцы, іншыя знакі. Праўда, было некалькі туркаў-месхецінцаў, якія рускай мовай валодалі, як і таджыкі, узбекі, іншыя, хто там працаваў. Аплата працы была па дагавору. У гадзіну — 42 рублі, расійскія, канешне. Гэта за восем гадзін, калі працуеш звыш — вышэй напалову. Калі ў выхадны — удвая.

Фірма вялікая. Галоўны яе офіс у Маскве. А ў Піцеры фірма будуе для японцаў аўтамабільны завод «Таёта». Я працаваў на ўзвядзенні заводскага офіса. Туркі эканомяць. Моцны, жалезны робіцца толькі каркас. А ўсе сцены з гіпсакартону. Вось гэтым і займаўся. Трэба сказаць, што яны за працоўнай дысцыплінай не вельмі сочаць. Застанешся на зверхурочныя — паглядай, дзе майстар, а так можаш і «сачкануць». І паказушнікі, нібы мы ў савецкія часы: як толькі прыязджаюць заказчыкі-японцы, усюды наводзіцца бляск, зганяюцца на аб'ект рабочыя. Вось, маўляў, як у нас усё тут кіпіць.

— Ну, а як жылося пасля працы?

— Тут кантракт таксама захоўваўся. Рабочыя-туркі жылі, канешне, у гасцініцы. Мы ж — у інтэрнаце за горадам. Гадзіну-паўтары ехаць на фірмовым аўтобусе. Канешне, у пакоі шэсць чалавек. Душ на калідоры. Але ж прыехалі мы не ў санаторый адпачываць.

Выдалі спецадзенне, такое, што не сорамна ў горад выйсці, цёплае, пухавое, спецыяльныя боты. І карміла фірма бясплатна. У іх там свая сталоўка. Толькі — кухня турэцкая. Як наваляць перцу ды нейкай кіслюціны — паліць. А самі туркі ў гэтыя стравы яшчэ па жмені перцу дадаюць. Ядуць, толькі вадой запіваюць. Праўда, белы хлеб, чорнага яны не ядуць, масла, цукар, чай — колькі захочаш. Не было і свініны, але ялавічына, бараніна, часта на вячэру куры.

— Дык у чым няўдача? Можна было працаваць.

— Справа ў тым, што я нечакана для сябе захварэў. Тэмпература пад сорак, у грудзях заложана — кашляць нельга. Быў у фірме свой доктар, ды што — выпіша таблеткі, і ўсё. А медыцынская страхоўка ў кантракце не прадугледжана. Як вылечыцца? Памучыўся — і паехаў дадому. Са мной разлічыліся сумленна, нават за пару дзён, што я хварэў. Вось такі мой няўдалы ваяж. А ўвогуле ехаць працаваць у іншую краіну, можа, і выгадна, але не зусім зручна, некамфортна. Адчуваеш сябе чужым сярод іх, асабліва з прадстаўнікамі міліцыі. Хоць...

Алесь КАСЦЕНЬ.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.22	20.01	13.39
Віцебск —	6.09	19.53	13.44
Магілёў —	6.12	19.51	13.39
Гомель —	6.11	19.45	13.34
Гродна —	6.37	20.16	13.39
Брэст —	6.41	20.14	13.33

Месяц

Апошняя квадра ў 21.05

Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Іларыёна, Сцяпана, Яўстрата;*

К. *Малгажыты, Міхаліны, Барыса, Генрыха, Макара, Міхала.*

Надвор'е на заўтра

…у суседзяў

ВАРШАВА	+11 — +13 °С	МАСКВА	+6 — +8 °С
ВІЛЬНЮС	+6 — +8 °С	РЫГА	+7 — +9 °С
КІЕЎ	+13 — +15 °С	С-ПЕЦЯРБУРГ	+3 — +5 °С

Без ападкаў

Правление СПК «Деревное»
Столбцовского района Минской области

ПРИГЛАШАЕТ НА РАБОТУ:

- ***главного инженера-энергетика,***
- ***главного бухгалтера,***
- ***животноводов.***

Жилье предоставляется.

Конт. телефоны: 8-01717-50-001, 58-217, 58-298.

Віншаванні

Віншуем з 60-годдзем ***Валянціну Леанідаўну КРАЎЦАВУ.*** *Жадаем радасці і шчасця і ў бадзёрасці да вяселля праўнукаў дажыць.*

Блусянкова з сям'ёй.

Віншуем з днём нараджэння ***Алену Мікалаеўну ЛЫСЮК*** *з г. Гомеля. Жадаем радасці, светлай надзеі, доўгіх гадоў жыцця.*

Родныя.

Віншуем з днём нараджэння ***Вольгу Іванаўну КАРАЛЁНАК*** *з в. В. Мыса.*

Хай будзе заўсёды здароўе і сіла,
Жыццё няхай будзе доўгім, шчаслівым.

Родныя.

Inter-ПОЛ

ШЭРЫФ ВЫЛУЧЫЎСЯ СУМЛЕННАСЦЮ

Шэраф паліцыі амерыканскага гарадка Кеваскум, што ў Вісконсе, парушыўшы правілы дарожнага руху, сам сабе выпісаў штраф.

Рычард Небель, як кажуць яго калегі, заўсёды адрозніваўся сумленнасцю. Не падкачаў шэрыф і ў гэты раз: Рычард ехаў па чатырохпалоснай дарозе, калі яго ўвагу адцягнуў смеццявоз, які нечакана спыніўся. Паліцэйскі стаў абганяць грузавік і не заўважыў школьны аўтобус, што стаяў, перад якім па правілах неабходна затармазіць. Далей шэрыф зрабіў тое, што не ўсім бы яго калегам прыйшло ў галаву — сам сабе выпісаў штраф на 235 долараў за парушэнне правілаў дарожнага руху, а таксама паставіў чатыры штрафныя балы. Квітанцыю ён аплаціў на наступны ж дзень.

У МУЗЕІ ЎКРАЛІ ЗОЛАТА

Работнікі японскага музея паплаціліся за залішні клопат аб наведвальніках. Пасля таго як людзям было дазволена дакранацца да блока залатых зліткаў агульнай вагой у 100 кілаграмаў, гэты неверагодна дарагі экспанат коштам у 1,71 мільёна долараў быў бессаромна выкрадзены.

Трое мужчын у масках уварваліся ў музей у невялікім цэнтральным горадзе Такаяма, пакуль іх саўдзельнік займаўся назіраннем звонку, схапілі зліткі і, адпіхнуўшы работніцу музея, зніклі. «На экспанаце не стаяла ніякай сігналізацыі або абароны ад зладзеяў нават пасля таго, як музей дазволіў сваім наведвальнікам дакранацца да яго», — паведаміла работніца паліцыі. У праваахоўных органах не разумеюць, чаму работнікі музея выставілі сапраўдныя залатыя зліткі і не паклапаціліся пра іх бяспеку.

Падрыхтаваў Ігар РЫГОРАЎ.

Дзве даты

10 красавіка



1912 год — у час свайго першага плавання з англійскага горада Саўтгемптана ў Нью-Йорк сутыкнуўся з айсбергам і патануў лайнер «Тытанік». Загінула, па розных звестках, ад 1400 да 1517 чалавек. Усяго на борце знаходзілася 2200 чалавек — пасажыраў і членаў экіпажа.

1492 год — у пісьмовых крыніцах упершыню згадваюцца Ляхавічы — як цэнтр воласці. У той час Ляхавічы былі не толькі аграрна-гандлёвым паселішчам, але і адміністратыўна-гаспадарчым цэнтрам буйнога маёнтка, з 1551 года належалі вялікаму князю Жыгімонту II Аўгусту. У XVI стагоддзі быў пабудаваны замак, вядомы пад назвай «Ляхавіцкая фартэцыя». Замак вытрымаў 8 асадаў і лічыўся адным з найманейшых у Рэчы Паспалітай. Разбураны шведамі падчас Паўночнай вайны.

Цытата дня

«Хто рухаецца наперад у навуках, але адстае ў маралі, той, хутчэй, ідзе назад, чым наперад».

Арыстоцель (384—322 да н.э.), грэчаскі філосаф.

Усміхнёмся!

Мужык злавіў таксі. Уладкаваўся добра на заднім сядзенні і пад ціхую прыемную музыку крыху задрамаў. Праз некаторы час штурхае вадзіцеля ў плечы. Той з дзікім воклічам кідае руль, аўтамабіль ідзе юзам і ўразаецца ў дрэва. Мужык лаецца, вылазіць з-пад абломкаў. Вадзіцель просіць прабачэння:

— Выбачай, мужык! Трэці дзень на таксі працую, да гэтага 15 гадоў катафалк вадзіў...

☺

Экзамен на лікёра-гарэлачным факультэце. Заходзіць студэнт, выкладчык налівае яму і пытаецца:

— Што гэта?

Студэнт спрабуе і адказвае:

— Гэта кагор, 5-гадовай вытрымкі, сорт вінаграду такі і такі, сабраны там і там і г.д.

Выкладчык, здзіўлена:

— А вось гэта?

— А гэта каньяк з такойсьці правінцыі Францыі.

— А вось гэта?!

— А гэта гарэлка (і далей).

Настаўнік у задавальненні бярэ залікоўку, адчыняе і крывіцца:

— Цьфу ты, зноў з Палітэха прыйшлі пахмяляцца...

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Рыбы будуць толькі ствараць, а Казярогам давядзецца пазмагацца

АВЕН. Поспех будзе залежаць ад вашага ўмення навучацца і прымяняць веды, якія атрымалі на практыцы. Начальства дапаможа ў дасягненні пастаўленай мэты, але яна павінна быць рэальнай. Вы станеце больш адчувальныя да меркавання навакольных. Не чапляйцеся за мінулае — лепш шукайце новае прымяненне сваім здольнасцям. Прыдадуцца такія якасці, як акуратнасць і цярпенне. У панядзелак можа паступіць важная інфармацыя, якую будзе неабходна праверыць на прадмет скажэння. У сераду будзе карысна заняцца пабудовай планаў — вам лёгка ўдасца стварыць карціну вашай бліжэйшай будучыні. У пятніцу будзьце больш асцярожнымі пры зносінах з сябрамі і на рабоце, не правакуйце канфлікты. Верагодная дапамога з боку родных.

ЦЯЛЕЦ. Добры тыдзень для павышэння энергетычнага патэнцыялу і ўмацавання здароўя. Заразвы можаце раскрыць свае здольнасці, ярка і таленавіта праявіць сваю натуру. Удача на гэтым тыдні будзе спадарожнічаць у многім. Адчуеце прыліў сіл і актыўнасці, таму справіцеся з усякай работай, за якую б ні ўзяліся. Адзінае, ад чаго варта ўстрымацца, — гэта ад удзелу ў новых праектах, якія могуць нечакана з'явіцца. Аўторак лепш за ўсё прысвяціць гаспадарчым справам і сямейным праблемам. Чацвер спрыяльны для пастаноўкі як доўгачасовых, так і кароткатэрміновых мэтаў. А нядзеля — цудоўны дзень для разбурэння ўсяго ўстарэлага і стварэння новага.

БЛІЗНЯТЫ. Лёс можа прыгатаваць для вас нечаканыя віражы, таму залішняя прадбачлівасць не зашкодзіць. У аўторак пажадана праявіць асцярожнасць і прысвяціць час завяршэнню старых спраў. У сераду, у выпадку неабходнасці, вы зможаце скарыстацца дапамогай сяброў. У нядзелю будуць удалымі паездкі і камандзіроўкі, а таксама пачатак рамантычнага падарожжа. Тыдзень спрыяльны для рашэння сямейных праблем і стварэння ў доме ўтульнай, камфортнай абстаноўкі. Гаціце ад сябе прэч неабгрунтаваныя страхі.

РАК. Варта ажыццявіць свае патаемныя планы і задумы. Аднак некаторыя з іх давядзецца злёгку падкарэктаваць — у залежнасці ад развіцця падзей. Пажадана гэта рабіць у адзіноце. У суботу не варта ствараць канфліктных сітуацый: пазбягайце спрэчак на любую сур'ёзную тэму. Нават калі праўда на вашым баку, перамога, хутчэй за ўсё, дастанецца не вам. Спакойная абстаноўка ў нядзелю будзе спрыяць раскрыццю вашага творчага патэнцыялу.

ЛЕЎ. Тыдзень, хутчэй за ўсё, будзе гарманічны. Жаданне жыць і працаваць стане роўным і ўстойлівым. Сіл будзе хапаць на рэалізацыю ўсяго таго, што вы вырашыце здзейсніць. Значна ўзрасце асабістая энергетыка, таму вы будзеце вельмі артыстычнымі і лёгкімі на ўздым. Аднак у чацвер варта праявіць разумную асцярожнасць, бо канкурэнты могуць перайсці да актыўных дзеянняў. У пятніцу даваздецца пабегаць: вас будзе чакаць неверагодная колькасць розных спраў.

ДЗЕВА. Асаблівую вагу набудуць кантакты, сувязі і паездкі. Спрыяльныя заключэнні дагавораў з новымі партнёрамі, удалыя гандлёвыя аперацыі. Прывядзіце ў парадак усе дакументы — гэта зараз у вас атрымаецца лёгка і паспяхова. Можна таксама разлічваць на разумную падтрымку і дапамогу калег. Праяўляйце настойлівасць пры адстойванні сваіх інтарэсаў, і паспяховасць вам забяспечана. Добры момант для пачатку доўгачаканага адпачынку. Пазбягайце хатніх канфліктаў, будзьце асабліва ўважлівыя да бацькоў.

ШАЛІ. Тыдзень напоўнены рознымі шматабяцаючымі падзеямі. На працы пакажыце сябе неабходным і рашучым чалавекам, які не раздражняецца па дробязях, але і не дазваляе садзіцца сабе на шыю. У чацвер засяродзіцеся на рашэнні самай важнай праблемы — і поспех будзе спадарожнічаць вам. Не забывайцеся пра хатнія справы, паколькі іх ужо назапасілася дастаткова, але і не апускайцеся ў іх з галавой. Увечары ў пятніцу не адмаўляйцеся ад сустрэчы з блізкімі сябрамі. Нядзеля — добры дзень для паездак, сустрэч і атрымання важнай інфармацыі.

СКАРПІЁН. Навакольныя будуць прыслухоўвацца да вашага меркавання: не згубіце магчымасць паўплываць на сітуацыю, але не нагаварыце лішняга. У сераду выкарыстоўвайце толькі праверэныя метады — новаўвядзенні пачакаюць. Будзе не лішнім прыслухацца да парад старэйшых: не саромейцеся звяртацца да іх па дапамогу. У чацвер трэба праявіць сціпласць — не расказвайце ўсім і ўсюды пра свае дасягненні. Зайздрасць нядобразычліўцаў можа сур'ёзна вам нашкодзіць. У пятніцу апроч сціпласці вам спатрэбіцца здольнасць захоўваць асабістыя тайны.

СТРАЛЕЦ. Калі вы ў адпачынку, то самы час адчуць асалоду ад жыццёвых радасцяў. Але і да тых, чый адпачынак яшчэ не наступіў, фартуна будзе вельмі добразычлівай. Верагодны поспех на службе, якога вы зусім не чакалі. У дзелавых кантактах з партнёрамі праявіце асцярожнасць: верагодны падман, асабліва ў панядзелак. Будзьце больш уважлівыя пры рабоце з паперамі, дагаворамі, пры заключэнні здзелак. У пятніцу і суботу зносіны з дзелавымі партнёрамі могуць прынесці жаданы поспех. Больш строга аднясіцеся да свавольстваў дзяцей, бо яны могуць скончыцца вельмі сумна.

КАЗЯРОГ. Вам проста неабходна захоўваць унутраны спакой і сканцэнтравацца на самай важнай задачы: толькі так можна выйграць у няпростых сітуацыях, якія чакаюць вас на гэтым тыдні. Трэба быць больш уважлівымі да свайго акружэння, бо ў другой палове тыдня за вашымі плячыма могуць разгуляцца нежартоўныя страсці. Асцерагайцеся прымаць катэгарычныя рашэнні, будзьце больш адказнымі і асцярожнымі. Пастарайцеся не фарсіраваць выкананне доўгатэрміновых планаў.

ВАДАЛЕЙ. Удзяляйце асабліваю ўвагу зносінам з патрэбнымі і ўплывовымі людзьмі. Можа парадаваць нечаканае прызнанне вашых прафесійных заслуг.У чацвер і пятніцу ўпэўненасць у асабістых сілах зробіць усё за вас. У нядзелю варта перагледзець стратэгію адносінаў з роднымі, у першую чаргу — з дзецьмі.

РЫБЫ. Можа прыбавіцца папяровай справы. У першай палове тыдня будзе шмат сустрэч, зносінаў, тэлефонных званкоў. Вы зможаце стаць пасрэднікам у важнай справе. Пятніца — дзень, які падыходзіць для рамонту і пакупак, звязаных з бытавымі пытаннямі. У суботу пастарайцеся не прымаць неабдуманых рашэнняў, прыслухайцеся да голасу інтуіцыі. На гэтым тыдні ў вас будуць сілы толькі на стваральныя мэты, разбурэннем, адпаведна, займацца не варта.

КІРМАШ
штотыднёвы рэкламны выпуск № 11 (543)
аддзел рэкламы
287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Беліявестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Прадаецца

● Жылы драўляны дом у Нясвіжскім раёне пад знос.
Тэл. 8-029-135-79-31.

● Дом, сад, агарод 3 км ад г. Мядзел.
Тэл. (8-01797) 38-170.

● Дом, участак 12 сотак у г. Стоўбцы, будаўнічыя матэрыялы — брус, цэгла.
Тэл. (8-01717) 34-653.

● Дом-дача ў в. Каменка Шчучынскага раёна, тэлефон, вялікі сад, агарод, недабудаваны драўляны дом 8х9, зручны для перавозу.
Тэл. (8-01514) 35-017.

● Здаецца ў арэнду добры дом у вёсцы (агарод, лес, рака), за 80 км ад Мінска.
Тэл. 501-63-30.

● Кватэра ў 2-кватэрным доме, які будуецца, з майстэрняй, пастаяннае справа для будаўніка, сямейнага без шкодных звычак з пачатковымі матэрыяльна-тэхнічнымі сродкамі (у Брэсцкім раёне).
Тэл.: 8-029-801-69-81, 8-025-901-69-81.

● Прадам ці здам у арэнду дом з г/п, лазняй, маецца сад, агарод, побач лес, рака ў Бярэзінскім раёне.
Тэл. (8-017) 231-16-23.

● Жылы дабротны дом з г/п, сад, агарод, калодзеж, у в. Габруны, за 15 км ад Нясвіжа.
Тэл.: (8-01770) 35-388, (8-017) 214-92-03.

● Драўляны дом (прыродны газ, ацяпленне), участак у в. Баяры Нясвіжскага раёна.
Тэл. у Мінску 8-029-610-56-62.

● Рухавік да «Мерседэса» 200Д з КПП, трактар Т-20, кормаздрабняльнік.
Тэл.: (8-01718) 34-368, 8-029-857-67-76.

● Бульба буйная 700 руб. за 1 кг: 1 тона, з дастаўкай (Валожынскі раён).
Тэл. (8-01772) 302-80-35.

● Электрычная маслабойка, кормазапарнік, тры акны 1,5х1,5.
Тэл. (8-01718) 34-368.

● Гаспадарчыя агрэгаты да Т-25.
Тэл. (8-02357) 93-271.

● ГАЗ-31029 1995 г.в., бензін, чорны, тэрмінова, нядорага.
Тэл. 8-029-319-97-11.

● МТЗ-80 з гаспадарчымі агрэгатамі, прычэпам і з/ч да МТЗ.
Тэл. 8-029-754-52-55.

● Медагонка дзвюхрамачная.
Тэл. 8-029-757-20-16.

● Фотапавелічальнік УПА 509, электрафон «Вега 110» стэрэа, добры стан, танна.
Тэл. у Мінску 275-53-94, Сяргей.

● Плуг, культыватар, акучнік.
Тэл. (8-01772) 39-294.

● «Рэно-сцэнік» 1998 г.в., 1,6 газ-бензін, новая гума, кандыцыянер, электрапакет.
Тэл. 8-029-707-53-27.

Куплю

● Старыя фотаапараты, аб'ектывы, значкі па фотатэматыцы і паштоўкі.
Тэл. 8-029-850-17-29.

● «Аўдзі» ці «Фольксваген» з 1984 па 1998 г.в., можна з невялікімі дэфектамі.
Тэл. 8-029-771-51-78.

● Сельскагаспадарчыя агрэгаты да МТЗ, «Аўдзі», «Фольксваген», можна з дэфектамі.
Тэл. 8-029-507-88-19.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ
Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.

Тэлефон для даведак 287-17-79.

Пашпарт серыя_____ № _____ Выданы_____

_____

Подпіс_____ Дата_____

ГОДОВОЙ БАЛАНС ЗА 2006 ГОД

УСП «Седьмая линия»

220035 г. Минск, ул. Тимирязева, 65А, тел. (017) 289-92-56

(млн. руб.)

АКТИВ		ПАССИВ	
1	2	3	4
Основные средства	20,8	Источники собственных средств, всего	1198,3
Нематериальные активы	5,8	в том числе: уставный фонд	1111,9
Финансовые вложения, всего:	2857,3	резервный фонд	16,7
в том числе: инвестиции в дочерние общества	-	добавочный фонд	41,7
инвестиции в другие организации	-	фонд накопления	10,1
облигации и другие долговые обязательства	2857,3	фонд потребления	4,8
прочие финансовые вложения	-	целевое финансирование	-
Доля перестраховщиков в страховых резервах	-	нераспределенная прибыль прошлых лет	-
Дебиторы, всего:	12,7	нераспределенная прибыль отчетного года	13,1
в том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	-	Страховые резервы и фонды, всего	3311,8
		в том числе: страховые резервы	3304,1
депо премий по рискам, принятым в перестрахование	-	фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	7,7
дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	12,7	Гарантийные фонды	-
Прочие активы, всего	1616,7	Кредиторы, всего	2,4
в том числе: незавершенное строительство	-	в том числе: кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	0,2
материальные ценности и затраты	21,2	:кредиторская задолженность по операциям перестрахования	-
денежные средства	1595,5	депо премий по рискам, переданным в перестрахование	-
собственные акции (доли)	-	заемные средства	-
прочие активы	-	кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	2,2
Непокрытые убытки прошлых лет	-	Прочие пассивы	0,8
Непокрытые убытки отчетного года	-		
БАЛАНС	**4513,3**	**БАЛАНС**	**4513,3**

ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ ЗА 2006 ГОД

УСП «Седьмая линия»

220035 г. Минск, ул. Тимирязева, 65А, тел. (017) 289-92-56

(млн.руб.)

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
I. Страхование жизни		
Страховые взносы (премии)	010	1923,9
Страховые выплаты	020	358,4
Изменение резерва по страхованию жизни, (+ или -)	030	-1547,4
Отчисления в гарантийный фонд	040	54,6
Расходы на ведение дела	041	106,6
Результат от операций по страхованию жизни, (+ или -)	050	-143,1
II. Страхование иное, чем страхование жизни, (+ или -)		
Страховые взносы (премии) — нетто перестрахование (+ или -)	064	-
Изменение резерва незаработанной премии —нетто перестрахование (+ или -)	067	-
Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто перестрахование:	082	-
Изменение резервов убытков — нетто перестрахование (+ или -)	092	-
Изменение других технических резервов (+ или -)	100	-
Изменение иных страховых резервов (+ или -)	105	-
Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды	110	-
Расходы на ведение дела	120	-
Комиссионное вознаграждение в тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	-
Комиссионное вознаграждение в тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	122	-
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни, (+ или -)	130	-
III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II		
Операционные доходы	140	171,9
Операционные расходы	145	12,7
Внереализационные доходы	150	129,9
Внереализационные расходы	155	4,6
Финансовый результат	157	141,4
Использовано прибыли	158	128,3
Нераспределенная прибыль (убыток) отчетного периода (+ или -)	170	13,1

Бухгалтерская отчетность УСП «Седьмая линия» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 01.01.2007 г. и результат финансово-хозяйственной деятельности за 2006 г. Аудитор Волчкова А.К. Лицензия на осуществление аудиторской деятельности в страховании № 02200/0061832 от 15.02.2006 г., выданная Министерством финансов Республики Беларусь.

КАРОВА, ЯКАЯ КОРМІЦЬ ВЕРШАМІ

Гэтыя вершы гучаць па-беларуску, але іх напісалі для дзяцей польскія паэты.

Больш за 200 твораў 35 польскіх аўтараў пераклала на беларускую мову Інэса Кур'ян, навуковец і паланіст, супрацоўніца Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Анталогія польскай дзіцячай паэзіі, якая загучала па-беларуску, мае назву «Каляровая карова». Яна прасочвае развіццё традыцыі польскай паэзіі для дзяцей і юнацтва ад XVIII стагоддзя па цяперашні час. У кнізе змяшчаюцца тэксты на беларускай мове і польскія арыгіналы, якія суправаджаюцца біяграмамі і тэматычнымі ўкладальнікамі.

Праца над зборнікам вялася з 2002 года, выйшаў у свет ён дзякуючы мінскаму выдавецтву «Логвінаў». Разам з перакладчыцай над ім працаваў дызайнер Сяргей Ждановіч, а малюнкі рабіла віцебская мастачка Дзіна Даніловіч. Падобнай кнігі дагэтуль не выдавалася ў Беларусі.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Шайбу, шайбу!

ХЭНЛАН ВЕРЫЦЬ У БЕЛАРУСАЎ

Чалавек года-2006, паводле меркавання беларускіх хакейных спецыялістаў, экс-трэнер нацыянальнай зборнай па хакею Глен Хэнлан даслаў у Мінск з ЗША ліст падтрымкі ігракам, настаўнікам і балельшчыкам перад стартам чэмпіянату свету-2007. У сваім пасланні ён паведаміў, што сумуе па Беларусі, шкадуе, што не мае магчымасці трэніраваць зборную нашай краіны і рыхтаваць яе да першынства ў Маскве і Мыцішчах. Аднак Хэнлан упэўнены, што трэнерскі штаб зробіць усё магчымае. «Вы — лепшыя за ўсіх і можаце перагуляць любога, — піша галоўны трэнер клуба НХЛ «Вашынгтон Кэпіталз». — Мы пачалі з мары гуляць дзеля нашых дзяцей, нашых сем'яў і саміх сябе. Мы верылі, што гуляючы разам, можам перамагчы. Мы змаглі стаць сапраўднай сям'ёй і зрабілі першы крок — прайшлі ў 1/4 фіналу і сталі шостымі на чэмпіянаце свету. У Маскве давайце завершым пачатае. Вашы дзеці і мая сям'я будуць ганарыцца вамі. Увайдзіце ў гісторыю!»

Ірына ПРЫМАК.

Акцыя «Звязды» працягваецца!

ДЗІЦЯ — САМЫ ДАРАГІ ГОСЦЬ У ДОМЕ

Таццяна Мікалаеўна працуе настаўніцай у Мядзелі. Сама яна «Звязду» не выпісвае, але той нумар за 17 сакавіка ёй прынесла дырэктар школы, сказала: паглядзі, якую акцыю распачала газета... Таццяна Мікалаеўна ноччу так і не заснула. Асабліва ёй запалі ў душу вочы дзяўчынкі па імені Рыма. Раніцай яна пазваніла ў Мінск, дырэктару дзіцячага дома № 6 Тамары Эдуардаўне. Праз некалькі дзён жанчына пераступіла парог дзіцячага дома.

— Канешне, — расказвае яна, — калі я ўбачыла Рыму, то тых ва-

Кірылу ШЫНКЕВІЧУ 15 гадоў. Захапленне — камп'ютар. Вельмі любіць сваю малодшую сястрычку.

чэй — прамяністых, усмешлівых — ужо не было. Былі вочы дзіцяці, якое шмат перажыло. А калі я яе абняла і адчула, якія ў яе танюсенькія ручкі, худзенькія плечыкі... Божа мой!...

Яны ехалі дадому тры з паловай гадзіны. Спачатку на маршруткі да вакзала, расказвае Рыма, а потым на аўтобусе. А пасля прыйшлі ў вялікі, паводле слоў дзяўчынкі, дом («Там ёсць тры пакоі», — удакладняе яна), які Таццяна Мікалаеўна і яе муж пабудавалі самі. Рыма пазнаёмілася з дачкой Таццяны Мікалаеўны — 14-гадовай Машай. А наконт гаспадара дзяўчынка прызналася: «Я баюся вашага дзядзьку!». Увечары Таццяна Мікалаеўна парыла Рыме ножкі на кухні (выганялі прастуду), а потым папрасіла мужа аднесці дзяўчынку ў ложак. Гаспадар пасадзіў Рыму на спіну і павёз, і тая не магла ўтрымаць шчаслівай усмешкі. Яна тут жа прызналася: «Я вашага дзядзьку ўжо не баюся!». І мне расказвала: «Ён добры».

Рыма пражыла ў Мядзелі ўсе канікулы. Маша вучыла яе іграць на фартэпіяна, яны гулялі на камп'ютары, шпацыравалі па горадзе, хадзілі на рынак, дзе Таццяна Мікалаеўна купіла Рыме джынсы і заколкі. У гэтых джынсах я Рыму і ўбачыла на наступны дзень пасля яе вяртання ў Мінск. Яна мне расказала, што каштавалі яны 21 тысячу рублёў, і што там былі яшчэ красоўкі за 22 тысячы, але трэба было пакінуць грошы на зваротную дарогу. Таму з красоўкамі яны

Сяргею ХАНКЕВІЧУ 14 гадоў, ён адзін з лепшых футбалістаў школьнай каманды. Вельмі сціплы малады чалавек.

Насці ЗАБАЛОЦКАЙ сем гадоў. У дзіцячым доме яна нядаўна. Яе паспелі палюбіць за ўсмешлівасць і абаяльнасць.

Стасу ГУРСКАМУ 7 гадоў. Ён лёгка садзіцца на шпагат, робіць мосцік, становіцца на галаву... Ласкавы, паслухмяны і добразычлівы хлопчык.

пакуль пачакаюць. Яшчэ Рыма расказала пра кошку Лізу, тоўсценькага коціка Фёдара і маленькае кацяня Мурзілку. І пра сабаку, з якім яна нагулялася так, што ў шэрсці была ўся куртачка. Многае для дзяўчынкі было ўпершыню: напрыклад, мыццё ў лазні. Цяпер яна чакае наступнай паездкі ў Мядзел: «Мне там падабаецца. Я не хачу ў дзіцячым доме сядзець. Цёця сказала, што наступны раз забярэ мяне з брацікам Данілкам».

Калі яны прыехалі ў Мінск, Рыма так і сказала: «Хачу назад, дадому». Таццяна Мікалаеўна ўвесь панядзелак праплакала. Цяпер яна таксама чакае наступнай магчымасці забраць дзяўчынку і яе браціка. Шкада, што Мядзел так далёка, што на дарогу трэба шмат часу, інакш можна было б забіраць дзяцей кожныя выхадныя.

Таццяна Мікалаеўна зайшла ў групу да Данілы, дзе маленькія дзеткі, і пайшла адтуль з болем у сэрцы... Бо ўсіх не забярэш, а малыя заглядаюць у вочы, спадзяюцца. Дамашнія падтрымалі Таццяну Мікалаеўну. Маша гартала ў панядзелак фотаальбом, які Рыма забыла, углядалася ў тварык, у вочкі гэтай мілай дзяўчынкі і спрабавала зразумець тое, чаго не можа зразумець ніхто...

Калі я падымалася па лесвіцы ў дзіцячым доме, з душавой выйшаў з мокрымі валасамі Жэня Галушка. Ён з гонарам заявіў мне: «І мяне забіралі! У Баранавічы! Я там прабыў 4 дні! Мне там вельмі спадабалася. Сказалі, яшчэ будуць забіраць!».

Сям'я з Будслава з двума дзецьмі хацела запрасіць Крысціну Філіпчонак на канікулы, але дзяўчынка захварэла на ангіну, трапіла ў бальніцу, таму паездка адклалася. Яшчэ адна сям'я рыхтуе дакументы, каб забраць Насцю Злоціну.

— Усе сем'і, якія звяртаюцца да нас праз акцыю ў газеце, мне вельмі падабаюцца, — прызнаецца Тамара Эдуардаўна. А яна ведае, што кажа, бо ў дзіцячыя дамы, бывае, людзі прыходзяць не столькі каб дзецям дапамагчы — даць ім сваю любоў, колькі каб вырашыць за кошт гэтых дзяцей нейкія свае асабістыя праблемы: пазбавіцца пачуцця адзіноты, віны, болю ад страты... Тады ў выніку нікому не робіцца лепш.

Але вельмі хочацца спадзявацца, што ў нашым выпадку сапраўды ўсё інакш. **Званіце ў Мінскі дзіцячы дом № 6 па гарадскіх тэлефонах: 240-12-12, 340-93-32 (дырэктар — Тамара Эдуардаўна Саўчанка).** Напярэдзе майскія святы і летнія канікулы. Кожнага з гэтых дзяцей можна запрасіць да сябе ў госці. Каб яны хоць бы трошкі адпачылі душой.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА. Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Антону АЛЯКСЕЕНКУ 9 гадоў, вельмі таварыскі, цікаўны хлопчык, які здольны заўважаць прыгожае побач з сабой.



Аліне СМІРНОВАЙ чатырнаццаць. Кантактная, добразычлівая, летуценная дзяўчынка.

Ірыне ЛЕШЧАНКА 13 гадоў. Лепшая тэнісістка дзіцячага дома, увогуле, спартыўнае дзяўчо.

Даша РАБЯНОК у свае 11 гадоў можа проста геніяльна перайвасабляцца ў дарослых «цётачак» падчас тэатральнай гульні.

Андрэю КАЛІНОЎСКАМУ 14 гадоў, ён адрозніваецца сваёй здольнасцю працаваць, каб дасягнуць пастаўленай мэты.



Ілью КЛАЧКО 14 гадоў. У яго самы акуратны дзённік, школьная сумка і ўвогуле ўсе рэчы. Ён адносіцца да ліку тых рэдкіх дзяцей, каму не трэба нагадваць пра хатняе заданне.

Аліне БЕЛАЙ 15 гадоў, яе абралі старастай у класе, напэўна з-за яе акуратнасці, самастойнасці, любові да творчасці і, канешне, лёгкага характару.

Віктар МІКАДОН пра акцыю сказаў: «Хай бы малых разабралі...». Але пагадзіўся, што і 16-гадовым сяброўства з прыстойнымі людзьмі было б добрай падтрымкай.



Крысціна ДУБІНІНА вучыцца ў ліцэйскім класе, а гэта ўжо само па сабе кажа пра яе адказнасць і працаздольнасць. Ёй 14 гадоў.

белагропромбанк
традиции будущего

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

ПОБЕДИТЕЛЬ КОНКУРСА «БРЕНД ГОДА 2006»

220036 г. Минск, пр-т Жукова, 3
Контакт-центр банка: 8-8011-00-8011(звонок бесплатный на территории РБ),
(017) 218-57-77, 8-029-198-5-777(Velcom), 8-029-888-5-777(МТС), 8-025-918-5-777 (БеСТ)

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 ЯНВАРЯ 2007 ГОДА

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2006 г.	2005 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	1	73 680,3	67 570,4
3	Средства в Национальном банке	1102	2	71 266,6	88 965,9
4	Ценные бумаги:	1103		741 675,6	387 748,5
	для торговли	11031	3	-	22 386,6
	удерживаемые до погашения	11032	3.1	-	-
	в наличии для продажи	11033	3.2	741 675,6	365 361,9
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	129 008,2	42 760,6
6	Кредиты клиентам	1106	5	4 439 705,0	2 543 923,3
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	1 391,2	450,3
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	219 493,5	171 163,2
9	Прочие активы	1109	8	27 736,6	19 826,3
10	**ИТОГО активы**	110		5 703 957,0	3 322 408,5
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202	9	606 250,9	457 618,4
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	768 408,0	95 424,1
14	Средства клиентов	1206	11	2 399 063,2	1 393 776,5
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		24 711,7	60 347,9
16	Прочие обязательства	1209	12	50 622,5	24 801,1
17	**ВСЕГО обязательства**	120		3 849 056,3	2 031 968,0
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211	13	1 578 635,0	1 105 974,6
20	Эмиссионный доход	1212		-	-
21	Резервный фонд	1213		22 442,6	17 054,8
22	Накопленная прибыль	1214	14	99 973,1	44 702,7
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	153 850,0	122 708,4
24	**ВСЕГО капитал**	121		1 854 900,7	1 290 440,5
25	**ИТОГО обязательства и капитал**	12		5 703 957,0	3 322 408,5
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301	16	3 552 227,5	1 405 447,2
28	Обязательства	1302	17	615 581,4	71 668,0

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ НА 1 ЯНВАРЯ 2007 ГОДА

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2006 г.	2005 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		397 669,7	248 819,3
2	Процентные расходы	2012		244 808,6	143 145,6
3	Чистые процентные доходы	201	18	152 861,1	105 673,7
4	Комиссионные доходы	2021		125 628,5	96 061,5
5	Комиссионные расходы	2022		11 703,3	4 568,3
6	Чистые комисионные доходы	202	19	113 925,2	91 493,2
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	23 451,0	14 601,5
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	(-311,0)	629,2
9	Доход в форме дивидендов	205		12,1	1,7
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	38 164,4	15 891,0
11	Прочие доходы	207	23	11 629,8	17 270,9
12	Операционные расходы	208	24	174 588,9	154 317,7
13	Прочие расходы	209	25	6 289,4	3 246,2
14	Налог на прибыль	210		20 053,2	28 981,7
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		62 472,3	27 233,6
	Базовая прибыль на простую акцию			0,0	0,0
	Разводненная прибыль на простую акцию			0,0	0,0

ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА ЗА 2006 ГОД

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статей капитала / Наименование показателей	Символ	Уставный фонд	Эмиссионный доход	Резервный фонд	Накопленная прибыль	Фонд переоценки статей баланса	Всего капитал (сумма граф 4–8)
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	Остаток на начало года	3011	1105974,6	-	17054,8	44702,7	122708,4	1290440,5
2	Изменения статей капитала в течение отчетного года, в том числе:	3012	472660,4	-	5387,8	55270,4	31141,6	564460,2
2.1	Прибыль (убыток со знаком «минус») отчетного года	30121	X	X	X	62472,3	X	62472,3
2.2	Направление прибыли на пополнение фондов	30122	-	X	5387,8	(-5387,8)	X	-
2.3	Направление фонда дивидендов на выплату акционерам	30123	X	X	X	(-34,4)	X	(-34,4)
2.4	Внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	30124	472000,0	-	X	X	X	472000,0
2.5	Проведение переоценки статей баланса	30125	X	X	X	X	31158,9	31158,9
2.6	Перераспределение между статьями капитала	30126	17,3	-	-	-	(-17,3)	X
2.7	Прочие изменения	30127	643,1	-	-	(-1779,7)	-	(-1136,6)
3	Остаток на конец года	3013	1578635,0	-	22442,6	99973,1	153850,0	1854900,7

ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ НА 1 ЯНВАРЯ 2007 ГОДА

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2006 г.	2005 г.
1	**Потоки денежных средств от операционной деятельности**				
2	Полученные процентные доходы	7010		397 592,3	248 624,5
3	Уплаченные процентные расходы	7011		-238 518,3	-141 453,7
4	Полученные комиссионные доходы	7012		125 629,5	96 078,6
5	Уплаченные комиссионные расходы	7013		-10 913,9	-4 579,1
6	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	7014		21 966,1	14 632,8
7	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	7015		-311,0	629,2
8	Доход в форме дивидендов	7016		12,1	1,7
9	Прочие полученные доходы	7017		10 457,3	6 620,6
10	Прочие уплаченные расходы	7018		-172 390,1	-141 966,2
11	Уплаченный налог на прибыль	7019		-20 532,9	-34 192,5
12	Итого денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и обязательствах	701		112 991,1	44 395,9
13	Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке	7020		17 747,5	-48 729,4
14	Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах	7021		-341 408,9	-290 588,0
15	Чистое снижение (прирост) кредитов и других денежных средств в банках	7022		-94 953,3	-1 557,2
16	Чистое снижение (прирост) кредитов, выданных клиентам	7023		-1 913 590,8	-914 308,9
17	Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах	7025		-5 469,7	-2 720,4
18	Итого потоки денежных средств от изменения операционных активов	702		-2 337 675,2	-1 257 903,9
19	Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка	7030		148 835,6	286 482,0
20	Чистый прирост (снижение) кредитов и других средств банков	7032		656 953,5	24 448,2
21	Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов	7033		996 745,6	686 117,4
22	Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком	7034		-35 723,3	16 086,6
23	Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах	7035		4 985,4	1 702,4
24	Итого потоки денежных средств от изменения операционных обязательств	703		1 771 796,8	1 014 836,6
25	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности	70		-452 887,3	-198 671,4
26	**Потоки денежных средств от инвестиционной деятельности**				
27	Приобретение основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов	7110		-22 343,2	-24 554,9
28	Реализация основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов	7111		664,6	199,6
29	Приобретение долгосрочных финансовых вложений	7112		-940,9	-14,2
30	Реализация долгосрочных финансовых вложений	7113		-	0,7
31	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности	71		-22 619,5	-24 368,8
32	**Потоки денежных средств от финансовой деятельности**				
33	Эмиссия акций	7211		472 661,4	217 000,6
34	Выкуп собственных акций	7212		-	-
35	Продажа ранее выкупленных собственных акций	7213		-	-
36	Выплата дивидендов	7214		-33,0	-3 348,0
37	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности	72		472 628,4	213 652,6
38	Влияние изменений официального курса на денежные средства и их эквиваленты	73		-119,8	-1 933,5
39	Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов	74		-2 998,2	-11 321,1
40	Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода	740	1	103 772,7	115 090,2
41	Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода	741	1	100 774,5	103 769,1

Председатель Правления С.Н. Румас
Главный бухгалтер М.А. Шаповалова
Бухгалтерская (финансовая) отчетность достоверно во всех существенных отношениях отражает финансовое положение, результаты деятельности и движение денежных средств ОАО «Белагропромбанк» за 2006 год в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь, касающимися подготовки бухгалтерской (финансовой) отчетности.
Директор УП «САБ-КОНСАЛТ» Л.В. Трикоза
Генеральная лицензия НБ РБ № 9 от 01.04.2002 г. Общая лицензия НБ РБ № 20 от 01.04.2002 г. Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 2 от 27.10.2006 г.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 35.265. Індэкс 63850. Зак. № 1971. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12